Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 коп.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навынарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . — 70 к. „ 3 „ . . . 2 р. — к. „ 6 „ . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя—30 к., мясцовыя . . . —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Абвесткі на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 коп. За кожны дадатковы . . . 15 „ Бесплацныя і чырвонаармейцы за дакумант . . . 15 „ За кожны дадатковы . . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'а—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАЧЫ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 139 (2031) Чацьвер, 23-га чэрвеня 1927 г.

Пленум ЦКК КП(б)Б, які быў прызначаны на 27-VI, адкладзен на 4-VII г. г. Сэкратар ЦКК КП(б)Б ВІЛЯНСТОВІЧ.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ЛІПНЁВЫХ ЮБІЛЕЯЎ І КАМПАНІЯЎ!

УСІМ ЧЛЕНАМ КП(б)Б МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ФРАКЦЫЯМ КП(б)Б САВЕЦКІХ, КААПЭРАЦЫЙНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ДАБРАХВОТНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ.

Паважаныя таварышы!

У працягу ліпеня павінен быць адзначаны цэлы шэраг юбілейных датаў і кампаній: міжнародны дзень каапэрацыі (2 і 3 ліпеня), дзень Канстытуцыі СССР (3-га ліпеня), гадавіны ліпнёвых дзён 1917 г. (10 ліпеня), вызваленьне Беларусі ад белапалякаў (11 ліпеня).

Апошнія два дні супадаюць з дніямі пачатку кампаніі — „Тыдзень абароны краіны".

У сувязі з абостранай міжнароднай абстаноўкай: англа-савецкі разрыў, забойства т. Войкава і асабістае апраўданьне забойцы польскім судом, шэраг тэрарыстычных актаў з боку агэнтаў міжнароднага капіталу ўнутры краіны—здарэньні ў Менску, Ленінградзе, падпал фабрык, заводаў і г. д.,—правядзеньне вышэйпералічаных кампаній і юбілейных датаў набывае асабліва важнае палітычнае значэньне.

Менскі акруговы камітэт КП(б)Б прапануе камуністычным фракцыям савецкіх, прафсаюзных, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый намеціць на падставе разасланага пляну і ажыцьцёвіць цэлы шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў, зьвязаных з правядзеньнем гэтых кампаній, у першую чаргу разгарнуць шырокую масавую работу шляхам арганізацыі мітынгаў, сходаў, лекцыяў, дакладаў, прагулак, экскурсій і інш., завастраючы ўвагу працоўных мас на міжнародным становішчы (небясьпека вайны) і чарговых задачах сацыялістычнага будаўніцтва, накіраваных да ўзмацненьня нашай прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Разам з тым кожная з грамадзкіх арганізацый павінна намеціць шэраг практычных мерапрыёмстваў на сваёй лініі, вынікаючых з агульных задач абароны краіны і сацыялістычнага будаўніцтва.

За сэкратара Менскага акружкому КП(б)Б ГЕРШОН.

Дзьве Польшчы—два адказы.

На другую нашу ноту ўраду Польшчы з патрабаваньнем дакладнага сьледзва на справе забойцы тав. Войкава і выгнаньня з тэрыторыі Польшчы белагвардзейцаў-тэрарыстаў, простага адказу да гэтай пары ня было. Але ўкосным адказам на гэтыя справядлівыя патрабаваньні быў суд над забойцам тав. Войкава і ўхвалены прысуд.

Польскі «надзвычайны» суд, вядомы сваёю суровасьцю ў адносінах да рабочых і сялян, растрэльваючы бязьлітасна юных камсамольцаў—амаль дзяцей— у даным выпадку выявіў жаласьлівую мяккасардэчнасьць, дараваўшы жыцьцё забойцы, ды яшчэ хадайнічаўшы перад вярхоўнай уладай аб вымякчэньні прысуду. Забойца Войкава можа быць накоўным за свой лёс: яго зутка, паціху вывядуць з астрогу і забясьпечаць матар'яльна. Наконт гэтага ёсьць у Польшчы пераканаўчыя прыклады.

Гэткі адказ буржуазнае Польшчы—Польшчы капіталістаў, абшарнікаў і генэралаў.

Не зважаючы на зроблены ўгавор, што Польшча павінна выселіць усіх белагвардзейцаў, балахоўцаў, пятлюраўцаў і іншыя усякага тыпу арганізацыі, якія наладжваюць процісавецкія выступленьні на польскай тэрыторыі, усё ж Польшчай ня выконваецца. Гэтыя разбойнікі з вялікае дарогі ня толькі знаходзяць прытулак у Польшчы, але яшчэ атрымліваюць афіцыйны дазвол ад польскага ўраду склікаць канфэрэнцыі, зьезды і сходы. Тэлеграмы паведамляюць, што 19-га чэрвеня гэтага году ў Кракове сабраўся зьезд пятлюраўцаў, на які зьехалася больш як 100 дэлегатаў. Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы Пілсудскаму і Масьціцкаму, у якіх ён выказвае польскаму ўраду падзяку за гасьціннасьць.

Што абгаварваў зьезд пятлюраўцаў—аб дабрабыце Польшчы, упарадкаваньні спрэчных спраў Мікалая Мікаласьвіча і Кірылы Аляксандравіча, ці можа аб новым бандыцкім нападзе на Савецкую Украіну? Польскаму ўраду, таксама як і нам, добра вядома, чым яны на зьездзе займаліся, а ўсё-ж ён не забараніў сабрацца пятлюраўцам на зьезд. Гэты зьезд лепш усякіх нот з выказваньнем «упэўненьняў ва ўшанаваньні» сьведчыць аб сапраўдным адказе Польшчы на забойства т. Войкава.

А існаваньне ўсёй кампаніі Паўлюкевіча з «Беларускім Словам», а кампанія Якаўлева з «Новай Расеяй», якія зусім адкрыта заклікаюць рабаваць савецкія пасольствы і забіваць савецкіх прадстаўнікоў,—хіба-ж іх афіцыйная і цалкам легальная праца на тэрыторыі Польшчы не гаворыць аб тым, што за рознымі «ушанаваньнямі» хаваецца нешта зусім іншае, што прымушае нас сумнявацца ў шчырасьці польскага ўрэду нават пасьля розных заяў і інтэрв'ю пана Залескага.

Пакуль не атрымаем яснага і выразнага адказу на гэтыя нашы запытаньні, мы ня можам быць спакойнымі за далейшы лёс польска-савецкіх узаемаад осін.

З кожным днём робіцца ўсё больш выразным і ясным голас іншае Польшчы—працоўных мас. Не зважаючы на цяжкае фашысцкае прыгнечаньне, рабочая Варшава выказалася бурнай дэманстрацыяй у часе пахаваньня тав. Войкава. Нібы працягам гэтае дэманстрацыі былі выбары ў прамысловых гарадох, якія на на гэтым тыдні адбыліся ў Прушкове і Влацлаўцы. У абодвых выпадках нелегальная, праслеудеемая кампартыя, аказалася самай моцнай па ліку галасоў. Вялізная большасьць рабочага насельніцтва адхілілася з агідай ня толькі ад буржуазных партый, але і ад здрадніцкіх-фальшывых згодніцкіх і стала цьвёрда над сьцяг камунізму.

Гэтага ня можа ня ведаць польскі ўрад, які пакуль што прыкрывае антысавецкую дзейнасьць чынпасьцю белагвардзейцаў.

Больш вытрыманасьці, менш панікі.

Нацыянальнае ўнутранае становішча Англіі, а да гэтага вялікія посьпехі кітайскай рэвалюцыі, якая падрывае самыя карэньні ангельскага імпэрыялізму, прымусілі ангельскіх цьвёрдалобых кідацца, як таго апалелага лева ў клетцы. Англія лічыць СССР прычынаю ўсіх яе няпрыгод. Страціць Кітай, а затым і Індыю, гэта значыць паставіць крыж над сусьветным панаваньнем краіны лёрдаў.

Адгэтуль, спачатку бязглуздыя ноты, затым напады на нашы пасольствы ў Пекіне і Лёндане і ўрэшце разрыў дыпляматычных і гандлёвых зносін.

Усё гэта рабілася з мэтай утварэньня адзінага фронту капіталістычных дзяржаў супроць СССР, з мэтай узброенага нападу на рэспубліку саветаў. Унутраныя супярэчнасьці, уласьцівыя імпэрыялістычнаму ладу, не далі Англіі шансаў для жаданага аб'яднаньня. Ня толькі ўзброеная інтэрвэнцыя, але нават і фінансавая блёкада сарваліся ў Жэневе, ня гледзячы на ўсе захады Чэмбэрлена.

Англія пакуль што засталася ізаляванай. Нават фашысцкая Італія і тая ня стала ў адзіным шэрагі з сваім патронам. Мы добра ведаем аб памерах Англіі—вось чаму мы кажам рабочаму і селяніну: Будзь на варце, трымай порах сухім. Вось чаму мы выкінулі лёзунг абароны дзяржавы працоўных, бо мы хочам міру, хочам спакою для далейшага сацыялістычнага будаўніцтва.

Але ў нашай краіне ёсьць яшчэ людзі, якія ўздыхаюць па цару Мікалаю, ёсьць і такія, што мараць аб буржуазнай дэмакратыі. Гэта кулакі на вёсцы, гэта нэпманы ў горадзе, гэта папы, равіны, ксяндзы; адным словам, усе тыя, якім стала цесна жыць у рэспубліцы рабочых і сялян. І яны ня дрэмлюць разам з ангельскімі шпікамі, яны ціха, патаемна вядуць сваю агідную працу.

Што ім трэба? Ім хочацца парушыць наша адзінства, нашу стойкасьць. І найлепшы спосаб для гэтага—насеяць паніку. Адгэтуль тыя байкі, якія мы чулі на вёсцы што вайна пачнецца 15 чэрвеня. Як гадзіны з пад карчоў яны сыкаюць розныя байкі, бо гэта-ж дае магчымасьць палавіць рыбку ў мутнай вадзе. Авось закачасцца валюта, тады можна зарабіць на чорнай біржы, а ў напалоханага селяніна купіць яго астатняе дабро за бясцэнак.

Сяляне і рабочыя павінны ў шыю гнаць усіх такіх сыкуноў. У пэрагах працоўных не павінна быць месца для панікі.

Трэба памятаць, што савецкі ўрад трымаецца ня толькі тым, што яго падтрымоўваюць мільёны працоўных СССР, якія гатовы галовы злажыць за завасёвы Кастрычніка, нашу краіну падтрымоўваюць і мільёны пролетарыяў у другіх краінах. Англія заваяваць з намі хоча, мы аб гэтым павінны памятаць і да гэтага рыхтавацца. Але Англія любіць ваяваць чужымі рукамі—а такіх ахвотнікаў, як мы бачым, ня надта многа, бо пачаць вайну ў імя інтарэсаў другое карыны, пачаць вайну, калі не зажылі раны ад вайны імпэрыялістычнай, павесьці рабочых Эўропы супроць рэспублікі саветаў—задача ня так-та лёгкая. Вось чаму мы кажам, што для панікі не павінна быць месца, бо гэтае панікі наш вораг і чакае. Супакой, жалезныя нэрвы, вытрыманасьць, далейшая ўпартая праца на падняцьцю нашай гаспадаркі, разам з работаю на ўзмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны—найлепшая гарантыя за працягненьне міру, за недапушчэньне вайны.

Усіх, хто сее паніку, трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці як найгоршых ворагаў працоўных.

А. Сяньковіч.

Як учыняуся „суд" над Кавэрдаю.

Суд усімі сродкамі імкнуўся абыйсьці і ўрэшце абышоў пытаньне аб падбухторшчыках да забойства.—Прамова пракурора больш падобна была на абарону, чым на абвінавачаньне.—Цынічныя заўвагі пракурора і прамовы абаронцаў, накіраваныя проці СССР.

Заява т. Розэнгольца прадстаўніком друку.

МАСКВА, Розэнгольц, які толькі што вярнуўся з Варшавы ў Маскву, у гутарцы з супрацоўнікам ТАСС перадаў свае ўражаньні аб судзе над Кавэрдаю.

Гэты працэс,—сказаў Розэнгольц, зьдзіўляе сваёю тэндэнцыйнасьцю. Ва ўсім працэсе выразна відаць была тэндэнцыя абмежаваць працэс прыцягненьнем да адказнасьці толькі аднаго Кавэрды. Праз увесь час падкрэсьлівалася, што Кавэрда адчуваў вялізнэныя матар'яльныя недахопы і, зразумела, што трэба было выявіць і прыцягнуць да адказнасьці асоб, якія далі Кавэрдзе сродкі на набыцьцё дорага каштаваўшага рэвальвэру. Гэта было захавана. Ёсьць весткі, што пры прыезьдзе Кавэрды ў Варшаву яму загадзя дапамагалі ў Варшаве знайсьці пакой.

Хто былі гэтыя асобы?

Працэс ня высьветліў гэтага страшэннага злачынства.

Пракурор у першую чаргу імкнуўся апраўдаць прычыны, якія выклікалі гэтае злачынства. Ён меў бессаромнасьць заявіць, што «Кавэрда любіць Расею і для гэтае Расеі адважыўся на ўчынак, забаронены ў нас законам». Ганебнае забойства савецкага пасланьніка, учыненае Кавэрдаю з-за вугла, тлумачыцца пракурорам, «як барацьба гэтых двух (Войкава і Кавэрды), якія абодва змагаюцца для Расеі і за Расею». Для маральнага апраўданьня злачынства пракурор заяўляе: «Мы ня можам глядзець на Кавэрду, як на прадстаўніка Расеі. Таксама мы ня можам глядзець па пасланьніка Войкава, як на прадстаўніка Расеі ў маральным сэнсе гэтага слова, у той момант, калі ў яго страляў Кавэрда. Гэта былі дзьве нязначныя кропелькі, якія стыкнуліся на хвалі жыцьця». Пракурор не знаходзіць іншых слоў для кваліфікацыі злачынцы, як «нявінны хлапчук, які любіць сваю бацькаўшчыну».

Абаронцы, выступаючы на карысьць Кавэрды, дазволілі сабе некалькі нячуваных выпадаў проці дзяржавы, з якою Польшча знаходзіцца ў нармальных дыпляматычных зносінах. Старшыня ня спыняў гэтых зьнявага нават падахвочваў іх.

Надзвычайны суд, у якім разьбіралася справа, мае толькі дзьве кары: растрэл і зьняволеньне на ўсё жыцьцё. Суд прысудзіў Кавэрду да апошняе кары, што бывае толькі ў выпадках, калі ёсьць у наяўнасьці надзвычайна зьмякчаючыя віну абставіны. Як відаць, прадстаўнікі польскае дзяржаўнасьці лічылі, што забойства савецкага пасланьніка, які праціваў не пакладаючы рук над паленьнем адносін між Савецкім Саюзам і Польшчаю, дае досыць падстаў для зьмякчэньня кары. Апроч таго, суд на сваёй ініцыятыве ўзьняў хадайніцтва перад прэзыдэнтам аб далейшай замене кары на 15 гадоў зьняволеньня.

Ня так даўно разглядалася ў судзе справа Энгеля, які зрабіў замах на паліцэйскага, і, нягледзячы на тое, што Энгелю было 18 год, ён быў прысуджаны да кары сьмерцю. Было і шмат другіх аналягічных выпадкаў. Гэткім чынам, справа не ў маладосьці злачынца, а ў палітычнай тэндэнцыйнасьці суду.

Нягледзячы на вынесены прысуд, працэс выяўвіў імкненьне прадстаўніка дзяржаўнага абвінавачаньня стварыць для злачынцы становішча «героя, які змагаецца за бацькаўшчыну». Гэткім чынам, працэс гэты палітычна сырыце дальнейшай тэрарыстычнай дзеяльнасьці манархічных арганізацый, што знаходзяць прыяцельскі прыём на польскай тэрыторыі. Пракурор у сваёй прамове спаслаўся, прыватна кажучы на маю заяву аб тым, што я ня мог думаць раней аб магчымасьці забойства ў Варшаве. Пракурор хацеў ложна абмаляваць гэту маю заяву, у зьвязку з чым я прымушан па гэтым пункце трохі спыніцца.

Я прыехаў у Варшаву з Англіі і Нямеччыны. У гэтых краінах, нават у Англіі, нягледзячы на няпрыязныя адносіны між ёй і Савецкім Саюзам, ў прадстаўнікоў Савецкага Саюзу была поўная асабовая бязпаска. Хоць Польшча і зьяўляецца больш маладою дзяржаўнаю адзінкаю, але мне, ня будучы непасрэдна знаёмым з польскімі ўмовамі, не магло прыйсьці ў галаву, што ў часе майго кароткага побыту ў Варшаве магчымы нападкі на савецкіх прадстаўнікоў і забойства іх, што не пакладаючыся на нармальную ахову бязпаскі, неабходна быць самому ўзброеным.

Толькі што закончыўшыся працэс сваёй страшэннай палітычнай тэндэнцыйнасьцю паказвае, што я, на жаль, мылуся, і што на польскай тэрыторыі не забясьпечана нават жыцьцё прадстаўніком савецкае дзяржавы, з якой Польшча знаходзіцца ў прыяцельскіх адносінах.

НАСТУП НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АРМІІ НА ІЧАН

ШЧЫРАЕ СПАТКАНЬНЕ УХАНСКІХ ВОЙСК У ШАСІ.—ПОЎНАЯ ДЭМАРАЛІЗАЦЫЯ ВОЙСК ЯН-СЭНА.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ СЬЦЯГВАЮЦЬ ВОЙСКІ Ў РАЙЁНЕ ЦЯНЬ-ЦЗІНЯ

Уханскае войска ўзяло Шасі.

Армія Ян-Сэна адступіла ў Ічан.

ШАНХАЙ, 21-VI. Японскае агэнцтва Тохо паведамляе, што ў зьвязку з прыходам другое, восьмае і 15-ае ўханскіх армій, войска Ян-Сэна накінула Шасі (правінцыя Хубэй).

Другая калёна ўханскага войска наступае з Чэнчжоу на Ічан.

Перад выхадам з Шасі, салдаты Ян-Сэна абрабавалі горад. Жыхарства з захапленьнем спаткала ўханскае войска. Магазыны, якія былі зачынены ў часе побыту там Ян-Сэна, адчыняюцца.

Частка войск Ян-Сэна, пакінуўшая Шасі, адступіла ў Ічан. Агэнцтва Тохо думае, што гэтыя войскі там не затрымаюцца, бо ўханскае войска прасоўваецца да Ічану. Жыхарства Ічана чакае разгрому пры нямінучым адступленьні Ян-Сэна. Усе дамы, у тым ліку шмат даноў, належачых японцам, заняты войскам, не зважаючы на неаднаразовыя пратэсты японскага консулу.

Цындао—узброены лягер імпэрыялістаў.

ШАНХАЙ, 21-6. У Цындао ў сучасны момант сканцэнтравана 16 чужаземных вайсковых суднаў. 2.400 японскіх салдат ахоўваюць подступы да чыгункі.

У Кіушыу знаходзіцца яшчэ 13.000 японскіх салдат, якія могуць быць перакінуты ў Цындао ў працягу 48 гадзін.

У Цянь-Цзіне, апрача рэгулярнага гарнізону, у складзе 1.900 салдат (гарнізон утрымліваецца на падставе пратаколу 1900 году), знаходзіцца яшчэ да 4.000 чужаземных салдат.

Цяньцзіньскі карэспандэнт «Норт Чайна Дэйлі Ньюс» паведамляе, што амэрыканскі генэрал Бэтлер у інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку заявіў: «Угаворы ня маюць нічога агульнага з тымі мерамі, якія могуць аказацца неабходнымі для выкананьня інструкцый аб абароне жыцьця амэрыканскіх грамадзян. Мы ўжывём любыя меры, якія палічым патрэбнымі».

Амэрыканскія салдаты знаходзяцца на тэрыторыі ранейшае нямецкае канцэсіі, якая знаходзіцца цяпер пад кітайскай юрысдыкцыяй. З гэтае прычыны «Норт Чайна Дэйлі Ньюс» піша: «Цікава, што скажуць наконт гэтага нацыяналісты, калі трапяць у Цянь-Цзін. У кожным выпадку Бэтлер ня выйдзе з кітайскае тэрыторыі»

Байкот японскіх тавараў пашыраецца.

Японская нота пратэсту нанкінскага ўраду.

ШАНХАЙ, 21-6. Агітацыя за байкот японскіх тавараў пачынае непакоіць японцаў, пражываючых у Шанхаі.

Японская газэта «Ніці-Ніці», якая выдаецца ў Шанхаі, піша: «Байкот набывае сур'ёзны характар, а кітайская ўлада адносіцца да гэтага бязуважна і ні ўжывае мер да прыдушэньня агітацыі, накіраванае проці Японіі. У выніку гэтага, магчымы сур'ёзныя дыпляматычныя ўскладненьні, аж да разрыву дыпляматычных зносін». Газэта далей паведамляе, што японскі віце-консул у Шанхаі паслаў нанкінскаму ўраду ноту пратэсту, у якой зазначаецца, што асобныя адказныя органы ўраду бяруць удзел у агітацыі і кіруюць ёю.

Кампанія за байкот ня спыняецца. Асабліва моцная агітацыя вядзецца сярод гандляроў. Саюз гандляроў мэдыкамэнтамі настанавіў спыніць закупку мэдыкамэнтаў у Японіі і перадаць заказы нямецкім фірмам. Саюз гандляроў японскімі таварамі тэлеграфаваў сваім агэнтам у Японію спыніць закупкі. Шмат гандляроў касуе зробленыя заказы, іншыя зусім спынілі гандаль японскімі таварамі аж да адмены байкоту.

Сялянскае паўстаньне ў райёне Тамінфу.

ШАНХАЙ, 21-6. У райёне Тамінфу на поўдні правінцыі Чжылі пядаўна выбухнула паўстаньне чырвоных пік. Паўночнае войска ўзяло ў палон і пакарала сьмерцю правадыра чырвоных пік Лю. У адказ на гэта, атрад чырвоных пік, колькасьцю ў 20.000, абкружыў Тамінфу. Барацьба між паўночным войскам і чырвонымі пікамі цягнулася некалькі дзён. Войска адступіла за гарадзкую сьцяну і чырвоныя пікі занялі ваколіцы гораду. Пасьля суровых боек, войску ўдалося адагнаць атрады чырвоных пік.

Японія схільна падтрымаць Чжан-Цзо-Ліна.

ТОКІЁ, 21-VI. «Ніці-Ніці» (лібэральная) у перадавым артыкуле залежнасьць Японіі ад Англіі і Амэрыкі ў адносінах бавоўны, нафты і інш. сыравіны.

Калі пачнецца вайна з гэтымі краінамі піша газэта — дык узброеныя сілы Японіі апынуцца бясьсільнымі пры адсутнасьці сыравіны. Таму японскія інтарэсы ў Манчжурыі і Манголіі патрабуюць самае пільнае ўвагі. Нашая палітыка ў Кітаі павінна імкнуцца да выкарчаваньня прычын рэвалюцыйнага руху ў Кітаі. Габінэт Танака павінен весьці ў Кітаі цьвёрдую палітыку і забясьпечыць вольны экспорт прадукцыі японскае прамысловасьці ў Кітаі.

Кампанія японскае прэсы проці Чжан-Цзо-Ліна за апошнія дні амаль спынілася. Газэты друкуюць паведамленьні, нібы японскія рэзыдэнты Шаньдуні патрабуюць перакідкі войск з Цындао ў Цынань. (галоўны горад правінцыі Шаньдунь).

Чан-Кай-Шы амніставаў контр-рэвалюцыйную шляхту.

ШАНХАЙ, 21. Згодна загаду Чан-Кай-Шы, вызваленыя арыштаваныя «бязначных падстаў асобы, належачыя да стану джэнтры, і выдатныя кіраўнікі гарадзкіх абшчын».

Орган Гаміндану «Чайна Кур'ер» называе загад Чан-Кай-Шы амністыяй палітычных злачынцаў і зазначае, што большасьць джэнтры былі арыштаваны камуністамі за перашкоды камуністычнай партыі, хоць арыштаваныя і спачувалі задачам Гаміндану.

Адклад суда над Бародзінаю.

ПЕКІН, 21-6. Судзьдзя Хэ, старшынствуючы на працэсе Бародзінай і дыпляматычных кур'ераў, захварэў на крывавуку. Калі адбудзецца наступнае пасяджэньне суду—невядома.

Склад новага пекінскага ўраду.

ПЕКІН, 21. Склад новага габінэту ў Пекіне гэткі: прэм'ер і міністр шляхоў—Пан-Фу, міністр замежных спраў—Ван-Гуй-Тай (таварыш міністра замежных спраў папярэдняга габінэту), вайсковы—Хофын-Лін.

ПАСЫЛКА АНГЕЛЬСКІХ ВОЙСК НА ПОЎНАЧ.

ШАНХАЙ, 21-VI. Сёньня з Шанхаю ў Вэй-Хай-Вэй пасланы батальён ангельскіх салдат.

УСЕКІТАЙСКІ ПРАФСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД У ХАНЬКОУ

Урачыстае адчыненьне.

ХАНЬКОУ, 20-VI. Сёньня ў перапоўненай залі народнага дому ў Ханькоу ўрачыста адчыніўся 4-ы ўсекітайскі зьезд прафсаюзаў. Ад імя фэдэрацыі прафсаюзаў зьезд адчыніў міністр працы Сю-Чао-Жэнь. У прывітальнай прамове міністр працы адзначыў ролю пралетарыяту ў мінулым пэрыядзе нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбы.

У прэзыдыум абрана 25 чалавек, у тым ліку Сэ-Чао-Жэнь, Лі-Лі-Сань і інш. Зьезд выбраў палітычную, эканамічную і агітацыйна-прапагандыцкую камісіі.

З прывітаньнямі зьезду выступілі Лазоўскі (ад Прафінтэрну) Рой (ад Камінтэрну) прадстаўнікі Гаміндану, нацыянальнага ўраду, ЦК кітайскае камуністычнае партыі, ЦК кітайскага камсамолу, палітычнае ўправы арміі, сялянскага саюзу, студэнцкіх саюзаў, піанэрскіх арганізацый і інш.

Дзелавая праца зьезду пачынаецца заўтра. У парадку дня наступныя пытаньні: даклад нацыянальнага ўраду і ЦК Гаміндану, сусьветны рабочы рух, палітычны даклад усекітайскае фэдэрацыі прафсаюзаў, арганізацыйныя пытаньні, зьмена статуту, выбары ў кіруючыя органы фэдэрацыі.

Зачыненьне зьезду прадугледжваецца 30-га чэрвеня.

Роспуск саюзу чырвоных франтавікоў у Дортмундзе.

БЭРЛІН, 15-VI. Паліцэй-прэзыдэнт Вэстфальскае правінцыі, член партыі цэнтру Граноўскі распусьціў мясцовую групу чырвонага саюзу франтавікоў у Дортмундзе. Роспуск адбыўся на падставе закону аб абароне рэспублікі. Граноўскі патрабаваў, каб усе члены дортмундзкае арганізацыі далі падпіску, з абавязацельствам не падтрымліваць чырвоны саюз франтавікоў, пад пагрозаю зьняволеньня ў астрозе да 5-ці гадоў.

Забарона чырвонага саюзу франтавікоў у Дортмундзе разглядаецца, як першы адказ ураду на збор чырвоных франтавікоў у Бэрліне.

РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ САВЕЦКІХ ЗАКАЗАЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ НА 318 МЛН. МАРАК.

БЭРЛІН, 15-VI. Водлуг вестак гандлёвага прадстаўніцтва СССР, у парадку выкарыстаньня крэдытаў, гарантаваных нямецкім урадам, савецкі ўрад разьмясьціў заказаў на 317.832.983 марак.

За кошт гандлю з Англіяй.

Пэрспэктывы пашырэньня экспорту СССР праз Данцыг.

ВАРШАВА, 21-6. У Данцыгу адбылася пад старшынством віцэ-старшыні сэнату Рыпшэ нарада з удзелам савецкага консула аб пашырэньні гандлю між СССР і Данцыгам.

Падсумоўваючы вынікі нарады, Рыпшэ заявіў: «Данцыгскі сэнат спадзяецца што савецкі ўрад высуне пэўныя прапановы, узяўшы пад увагу, што Данцыгскі порт можна будзе выкарыстаць для рэалізацыі часткі экспорту, які накіроўваўся раней у Англію.

Законапраект аб прафсаюзах нясе кансэрватарам паражэньне.

Вынікі кампаніі проці законапраекту ў Ляккашыры.

Л�ёНДАН, 15-VI. Паводле паведамленьня карэспандэнта «Дэйлі Геральд» з Блекбэрна, кампанія проці законапраекту аб прафсаюзах ва ўсходнім і паўночна-ўсходнім Ляккашыры разгортваецца з вялікім посьпехам. Камітэтам абароны трэд-юніёнаў абвешчана і распаўсюджана каля 2 мля. лістовак, растлумачваючых рэакцыйны сэнс законапраекту аб прафсаюзах. Камітэтам абароны праведзена звыш 350 мітынгаў, пад лёзунгамі барацьбы з законапраектам.

Вынікі кампаніі ў паяўнасьці. Сябры прафэсыянальных саюзаў, нават тыя з іх, якія зьяўляюцца членамі кансэрватыўнае і лібэральнае партый, аднадушна настроены проці законапраекту. На агульнай думцы, законапраект кансэрватыўнага ўраду зьяўляецца ўскую небясьпеку разьвіцьця ідэй кансэрватыўнае партыі сярод рабочае клясы. Рабочая партыя набыла тысячы новых саюзьнікаў.

Посьпех жаночых мітынгаў у апорных пунктах кансэрватыўнае партыі.

ЛЁНДАН, 15-6. «Дэйлі Геральд» паведамляе, што мітынгі, наладжаныя жаночым аддзелам рабочае партыі ў райёне Гляморгана, адбыліся з вялікім посьпехам. На мітынгах прысутнічала звыш 3.000 жанчын, пераважна жонак горнарабочых.

Посьпех мітынгаў тым больш паказальны, што Гляморган заўсёды лічыўся апорай кансэрватыўнае партыі.

„Англія аблічылася, парываючы з СССР".

Ангельская лібэральная газэта аб выніках жэнэўскае сэсіі.

ЛЁНДАН, 20-VI. Наконт жэнэўскіх перамоў лібэральная «Вэстмінстэр Газэт» піша ў перадавіцы, што хоць пытаньне аб агульнай палітыцы дзяржаў у дачыненьні да СССР і зьяўлялася прычынаю сур'ёзнага абмеркаваньня ў Жэневе, адпак, да гэтага часу гэтае абмеркаваньне ніякіх вынікаў не дало.

Водлуг слоў газэты, «можна, як відаць быць упэўненым, што Францыя і Нямеччына далі Польшчы параду захоўваць умераную пазіцыю ў дачыненьні да патрабаваньняў Расеі».

Газэта зазначае, што прадказаныя наконт «краху Расеі» так часта былі падманнымі, «што лепш будзе пачакаць і паглядзець чымся верыць заявам аб канчатковым крызісе бальшавізму».

«У будучым—піша, парэшце, газэта,—Англія зрабіла-б больш правільна, каб запытала парады ў іншых дзяржаў перадак, пасьля ўжыцьця якіх-небудзь захадаў».

Яшчэ адно „разброеньне"

БЭРЛІН, 21-6. Канфэрэнцыя 3-х дзяржаў (Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты, Англія і Японія) канфэрэнцыя па пытаньнях абмежаваньня марскіх узброеньняў у Жэневе адчынілася ўчора кіраўніком дэлегацыі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Гібсонам, які быў абраны старшынёю канфэрэнцыі.

Пасьля ўхвалы тэксту прывітальнае тэлеграмы Куліджу выступілі старшыні дэлегацый Злучаных Штатаў, Англіі і Японіі і падалі праграмныя заявы, якія будуць пакладзены ў аснову працы канфэрэнцыі.

ЗЬМЕНА ПОЛЬСКАЕ КАНСТЫТУЦЫІ.

ВАРШАВА, 21-6. Сойм ухваліў закон, зьмяняючы канстытуцыю ў тым сэнсе, што сойму надаецца права самароспуску, калі за гэта выказваецца дзьве трэці галасоў, пры наліччы найменш паловы законнае лічбы дэпутатаў.

Пэпэсэаўцы, падаўшыя гэтую заяву, мелі мэтай не дапусьціць прадоўжаньня паўнамоцтваў сучаснага сойму, калі-б гэтага захацеў урад.

Урадавы друк нездаволены пастановай сойму. Правыя партыі спадзяюцца выкарыстаць гэтую пастанову, каб дамагчыся ад ураду зьмены закону аб выбарчым праве.

* * *

Пастанова была прынята каля 12 г. начы, бо пры галасаваньні аказалася, што ў залі прысутнічае толькі 214 паслоў, а трэба 222 (палова 444).

Пры паўторным галасаваньні прысутнічала 225 паслоў—толькі на 3 больш, як трэба. З прысутных галасавала за зьмену 189, супроць—10.

Савецкія матацыклісты ў Варшаве.

ВАРШАВА, 21-VI. Сёньня а 9 гадз. раніцы ў Варшаву прыбылі савецкія матацыклісты Іўлеў, Казак, Філіпаў і Вуралец, выехаўшыя 17-га чэрвеня на двух матацыклях з Масквы. На 51 клм. ад польскае граніцы, адзін з матацыкляў папсаваўся. Філіпаву, які кіраваў машынай удалося папярэдзіць аварыю. Рэшту дарогі да Варшавы, г. зн. адлегласьць у 421 клм. Філіпаў ехаў на машыне, зьвязанай з двух мясцох рэмнем.

У чацьвер матацыклісты накіроўваюцца ў Вену. Удзельнікі выпярэдніцтва адчуваюць сябе вельмі бадзёра. Расейская гума вытрымала прабег дасканала.

НАПЯРЭДАДНІ АДСТАЎКІ РУМЫНСКАГА ЎРАДУ.

Да ўлады ідуць лібэралы.

ВЕНА, 21-VI. Румынскі прэм'ер Стырбэй зрабіў апошнюю спробу дамагчыся выбарчае згоды між лібэраламі і нацыянальнай сялянскай партыяй. Спроба скончылася няўдачай. У зьвязку з гэтым, сёньня чакаюць адстаўкі габінэту Стырбэя. Нацыянальная сялянская партыя заяўляе, што калі лібэралы захопяць уладу, дык нацыянальная сялянская партыя адмовіцца ад удзелу ў выбарах.

Канец італа-румынскае «дружбы».

ВЕНА, 21-6. Румынскае вайсковае міністэрства адклікала з Італіі пасланую туды ўрадам Авэрэску румынскую вайсковую місію, якой было даручана абсьледаваць прыёмку матар'ялаў, што здаюць італьянскія заводы ў лік вайсковых заказаў Румыніі.

Апроч таго, румынскае вайсковае міністэрства ўхваліла праверыць усе вайсковыя заказы, зробленыя ўрадам Авэрэску ў Італіі.

Зьмены ў вышэйшым румынскім камандаваньні.

ВЕНА, 21-6. Газэта «Лупта» паведамляе аб надыходзячых зьменах у складзе вышэйшага вайсковага камандаваньня ў Румыніі. Газэта заяўляе, што будуць звольнены начальнік румынскага генэральнага штабу, некалькі камандзіраў армейскіх карпусоў і вайсковыя інспэктары.

ТАВ. РАКОЎСКІ АДХІЛЯЕ „СЭНСАЦЫЙНЫЯ“ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ БУРЖУАЗНАГА ДРУКУ.

ПАРЫЖ, 21-VI. Усе францускія газэты, апрача правых, зьмяшчаюць наступную заяву Ракоўскага: »Абвяшчэньне хлусьлівых сэнсацыйных паведамленьняў можа надзвычайна абвастрыць становішча. Нам фальшыва прыпісваюць патрабаваньне выдачы Кавэрды і шмат іншых патрабаваньняў. Патрабаваньне савецкага ўраду аб роспуску манархічных тэрарыстычных арганізацый у Польшчы абгрунтавана па Рыскім угаворы і зьяўлялася прадметам абгавору яшчэ да забойства Войкава, вырыча па гэтым пытаньні ўжо была дасягнута згода.

Паведамленьні аб трэцяй савецкай ноце польскаму ўраду выдуманы. Масква чакае прыезду Залескага ў Варшаву, каб весьці далей перамовы аб палепшаньні польска-савецкіх адносін. Доказам гэтага зьяўляецца нашая прапанова Польшчы падпісаць угавор аб непападзе.

Ужо абвергнуты абмен няслушнымі нотамі між СССР і Фінляндыяй быў выдуман з мэтаю выклікаць канфлікты між СССР і яго суседзямі і ўзнаўніць правакацыю Савецкага Саюзу. У сапраўднасьці, на вуснае запытаньне прадстаўніка Фінляндыі ў Маскве савецкі ўрад растлумачыў, што Эльвенгрэн—ранейшы царскі афіцэр, прыбыўшы ў СССР з румынскім пашпартам вінаваты ў прыналежнасьці да манархічнае арганізацыі і ў тэрарыстычных актах—ня можа разглядацца, як фінляндзкі грамадзянін. Пісьмовае-ж запытаньне Фінляндыі атрымалася толькі 19-га чэрвеня.

Гэтае і іншыя абставіны даказваюць палічча прадумыснае дзейнасьці з мэтаю падмяніць мірнае ўзаадкаваньне інцыдэнтаў капіталістамі, здольнымі выклікаць вайну, пра-стварэньне такіх тэндэнцый у грамадзе, процістаяць якім урады ня здолелі-б.

Адмаўляючыся шукаць усіх вінаватых у газэтнай антысавецкай кампаніі, т. Ракоўскі заявачае, што манархічныя арганізацыі, ня маючыя ніякіх карэньняў у СССР, забойствамі і падпаламі правакуюць чужаземнае ўмяшваньне. «Адначасова арганізуемыя на тэрыторыі СССР замахі—піша далей т. Ракоўскі—павінны стварыць у прыхільнікаў чужаземнае інтэрвэнцыі ўражаньне нятрываласьці савецкае ўлады і лёгкасьці скасаваньня яе. Супаўшыя па часе замахі заграніцай, у прыгранічных раёнах СССР і ў Маскве, зьмест захопленых дакумантаў і паказаньні затрыманых асоб—усё гэта яскрава сьведчыць аб няправільнасьці вэрсый адносна індывідуальнага характару ўчыняемых злачынстваў і поўнасьцю апраўдваюць ужытыя савецкім урадам меры, накіраваныя да папярэджаньня паўтарэньня замахаў, пагражаючых спакою СССР і Эўропы.

Новы ЦК аўстрыйскае кампартыі.

ВЕНА, 21-VI. 9-ты зьезд аўстрыйскае кампартыі абраў новы цэнтральны камітэт партыі. Старшынёю ЦК абран Цыглер.

ВЕНА 21-VI. Новы ЦК аўстрыйскае кампартыі абран большасьцю 31 галасоў проці 13-ці галасоў меншасьці. Большасьцю 15-ці галасоў проці 3-х ухвалена рэзалюцыя, якая адабрае даклад і дзейнасьць ранейшага ЦК. Зьезд адназгодна зацьвердзіў выключэньне з партыі Фрэня і яго групы, а таксама мерапрыёмствы па ліквідацыі фракцыйнае барацьбы. Зьезд даручыў новаму ЦК весьці няшчадную барацьбу з фракцыйнасьцю.

У Заходняй Беларусі.

„ВЫКВАЛІФІКАВАНЫ“ ПОЛЬСКІ НАСТАЎНІК.

«Dziennik Wileński», газэта крайніх правых, паведамляе: «У Ашмянах арыштаваны настаўнік пачатковае школы Кулінёўскі за ненармальныя ўчынкі да малалетных вучаніц. Як сьцьверджана, ён учыніў агіднае злачынства адносна да больш як дзесятка дзяўчынак, выбіраючы сваіх ахвяр пераважна спаміж незаможных сем'яў.

Вось што вытварацоь «выкваліфікаваныя» польскія настаўнікі, гэтыя «шырыцелі польскай асьветы» сярод беларускіх дзяўчынак. Сколькі такіх ахвяр папалася ў рукі падобных злачынцаў, калі нават газэта пана Обста ня выцерпела і напісала.

ДАКАЦЦІЛІСЯ...

Як вядома, з адшчапенцаў ад разгромленае польскім урадам «Незалежнай Хлопскай партыі» паслоў польскага сойму Бона Шапеля і Шакуна ўтварылася так званая «Радыкальная хлопская партыя Беларускіх Зямель».

Партыя гэтая распачала сваю дзейнасьць з чаго, што агаласіла ў эндэцкай газэце «Pz. Wil.» вестку аб... нябывалай канфэрэнцыі з грамадаўскімі дзеячамі!

Усё-ж, ня было яшчэ ясна, па якім палітычным шляху пойдзе новая «партыя Беларускіх Зямель».

Цяпер гэта ўжо выявілася. У склад рэдакцыі, выдаваемае імі часопісі ў польскай і беларускай мове («Włościanin»—«Селянін») уваходзяць.. сябры рэдакцыі вядомае ўжо польскае часопісі ў беларускай мове «Беларускі Дзень», якую рэдагуе «былы беларус» п. Умястоўскі ў кампаніі з іншымі «былымі» беларускімі дзеячамі!

Разьвітальная вечарына ў віленскай бел. гімназіі.

На гэтай вечарыне (13 чэрвеня) настаўлены былі дзьве пьесы Янкі Купалы: «Паўлінка» і «На папасе», прайшоўшы з вялікім посьпехам. Пасьля гэтага выступаў гімназычны хор і ўрэшце дэклямацыя.

СТРАШЭННАЯ НАВАЛЬНІЦА Ў НАВАГРАДЧЫНЕ.

Страшэнная навальніца, якая пранеслася нядаўна па БССР, ня мінула і тэрыторыі Зах. Беларусі. Як падае «Kurjer Wileński» за 19-га чэрвеня, навальніца двойчы пранеслася па тэрыторыі Навагрудчыны, пры гэтым у першы раз—12 чэрвеня яна закранула паветы Слонімскі і Навагрудзкі, а ў другі—14 чэрвеня закранула Стаўпецкі, Баранавіцкі і Лідзкі паветы.

Па папярэдніх падлічэньнях страты ад навальніцаў даходзяць да 8.000.000 злотых (прыблізна—2 млн. руб.).

У Навагрудзкім пав. забіта 2, некалькі цяжка паранены, у Слонімскім—3 цяжка паранены, у Стаўпецкім—2 забіта і 2 цяжка паранены. Шмат людзей паранена лёгка.

Некалькі сот коняй і быдла забіта, Пасеваў зьнішчана у Лідзкім пав.—1000 гэктараў, у Навагрудзкім—4000 гэкт., Стаўпецкім—500 гэкт.

Лясоў зьнішчана—агулам каля 1000 гэктараў. Будынкаў—звыш 500.

ВЫПУСКІ ВІЛЕНСКАЙ І РАДАШКОЎСКАЙ ГІМНАЗІЙ.

Сёлета Віленскую Беларускую гімназію скончылі: поўны сямігадовы курс—16 вучняў і дадатковую восьмую клясу—6. Радашкоўскую гімназію скончылі 22 вучні.

ВЫБАРЫ Ў ГМІННЫЯ РАДЫ.

Цяпер адбываюцца ў Заходняй Беларусі выбары ў гмінныя рады.

Як паведамляе Віл. бел. газ. «Наша Праўда», усюды перамагае сьвядомае беларускае сялянства, выкідаючы за борт свайго грамадзкага жыцьця варожыя нашаму працоўнаму народу элемэнты.

Да апошняй пары ў гмінных радох усімі справамі кіравалі «выбраныя» панамі старастамі, абшарнікамі і ксяндзамі іх стаўленікі—розныя падпанкі, засьцянковыя шэршні, былыя панскія лёкаі і фурманы. Цяпер, як відаць, ваша сялянства з імі расквітаецца.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Разьмеркаваньне ўзнагарод між удзельнікамі „зорачнага“ пералёту.

МАСКВА, 21-VI. Камісія ТДА—Авіяхім СССР па арганізацыі вялікіх савецкіх пералётаў запьверзіла настанову журы аб выніках зорачнага пералёту.

Дзьве першыя прэміі (на 600 р.) прысуджаны экіпажам самалётаў (лётчык, летнік-наглядчык і мэханік), выляцёўшых з Растову і з Казані.

Дзьве другія прэміі па 400 р. прысуджаны экіпажам кіеўскага і бабруйскага самалётаў.

З тае прычыны, што ўсе ўдзельнікі пералёту добра выканалі свае задачы, не зважаючы на ўсе цяжкасьці, камісія павялічыла колькасьць трэціх прэмій (на 300 р.) і ўстанавіла 3 падахвочваючыя ўзнагароды. Трэцяя прэмія прысуджана экіпажам другога бабруйскага самалёту (лётнік Яхантаў, наглядальнік-Вакін і мэханік—Кулямоў) і двух менскіх.

Экіпажам ленінградзкага і лінецкага самалётаў за ўмелёт у выключна цяжкіх умовах прысуджаны падахвочваючыя ўзнагароды па 210 р. кожная. Такая-ж узнагарода прысуджана экіпажу кіеўскага самалёту за выяўленую настойлівасьць пры выкананьні палёту ў няспрыяючых умовах.

Вылазка апазіцыі асуджана ўсёй партыяй.

МАСКВА. З шмат якіх гарадоў паступаюць рэзалюцыі партыйных сходаў, якія выказваюць суровы пратэст проці апошняга выступу апазіцыянэраў на пленуме Камінтэрну.

АДЭСА 20-6. Агульнагарадзкі сход партыйнага актыву адзначае правільнасьць пастановы апошняга пленуму выканкому Камінтэрну па пытаньню аб кітайскай рэвалюцыі, ваеннай небясьпецы і з прычыны выступленьня апазіцыі на пленуме выканкому Камінтэрну, патрабуючы выключэньня з складу ЦК т. т. Троцкага і Зіноўева.

На пленуме выканкому КІМ'у.

МАСКВА, 21-6. 20-га чэрвеня пленум выканкому КІМ'у заслухаў два даклады аб задачах КІМ'у, у зьвязку з ваеннаю небясьпекаю. Дакладчык Шылер даў агляд ранейшае антымілітарысцкае дзейнасьці сэкцыі КІМ'у а таксама вылявіў агульную прыняцыповую і тактычную лініі па галоўных пытаньнях. Дакладчык Бійю асьвяціў практычныя задачы і мэтады працы ў арміі.

АДКАЗ КАРЭЛІІ НА ПРАВАКАЦЫЮ АНГЛІІ.

ПЕТРАЗАВОДЗК. Па усёй Карэліі праходзяць мітынгі, прысьвечаныя апошнім надзеям. Асабліва жвава праходзяць мітынгі ў прыгранічных паёсах. Сяляне ў рэзалюцыях выказваюць гатоўнасьць на першым закліку савецкае ўлады зьмяніць мірны фронт на баявы.

Гэтымі днямі па ўсёй Карэліі будзе праведзен тыдзень узмацненьня фінансавай і ваеннай абароны СССР.

Што далэ зьніжэньне цэн.

МАСКВА, 21-VI. 20-га чэрвеня адбылося пашыранае насяджэньне калегіі НК Гандлю СССР, на якім былі заслуханы даклады Цэнтрасаюзу і упаўнаважаных НК Гандлю СССР аб выніках зьніжэньня цэн на 1-га чэрвеня. Па ўсіх дакладах разгарнуліся шырокія спрэчкі, у якіх Макімаў, (намесьнік Наркамгандлю СССР) зазначыў, што лічыць дасягнутыя вынікі зьніжэньня цэн значнымі, бо эканомія ад зьніжэньня цэн да пачатку будучага апэрацыйнага году вызначаецца прыкладна ў 500 млн. руб.

Надсумоўваючы спрэчкі, Мікаян зазначыў, што адзіны бясспрэчны вывад можна зрабіць з усіх дакладаў, а імена: зьніжэньне адпускных цэн даведзена да спажыўца. Гэты вывад зьяўляецца надзвычайна важным. У большасьці гарадоў і сёл дырэктыва выканана, ці недалёка да выкананьня. Усю нашу ўвагу ў сучасны момант трэба накіраваць на палепшаньне якасьці нашае працы, на ліквідацыю недахопаў кампаніі.

АД'ЕЗД ДАМОЎ ФІНЛЯНДЗКАЕ РАБОЧАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

ЛЕНІНГРАД. Ад'ехаўшая ў Фінляндыю дэлегацыя фінскіх прафсаюзаў пакінула працоўным СССР ліст, у якім выказвае сваё зьдзіўленьне і захапленьне дасягненьнямі рабочых і сялян Саюзу і заяўляе, што рабочыя Фінляндыі будуць падтрымоўваць адзіны фронт і змагацца з пагрозамі новых войнаў.

Адшуканы невядомыя лясы і рэчкі.

ЛЕНІНГРАД. Ленінградзкая экспэдыцыя Акадэміі Навук выкрыла на берагох рэчкі Газ на поўначы Сібіру вялізныя драмучыя лясы, у якіх знаходзіцца шмат каштоўных пушных зьвароў і невядомыя да гэтага часу рэчкі.

На чырвоным Сахаліне.

АЛЯКСАНДРАЎСК-НА-САХАЛІНЕ. У гэтым годзе ў асяродку газавага райёну пачнецца пляноўка новага гораду—Охо.

На ўсім паўночным Сахаліне вельмі пасьпешна праходзіць збор сродкаў на пабудову самалёту. Рабочыя газавых промыслаў г. Охо і рабочыя капальняў г. Дуэ адлічылі аднадзённы заработак. Робяць узносы і тубыльцы.

Навальніца змыла чыгуначнае палатно.

ВЕРХНЯЎДЗІНСК, 21-VI. Некалькі дзён была вялікая навальніца, якая ўчыніла вялічэзныя зруйнаваньні на Забайкальскай чыгунцы. На перагонах Мысавая—Пасельская, Танха—Мысавая і Сяленга—Талаўка палатно размыта ў некалькіх мясцох, зруйнаваны чыгуначны мост і пасаваны некаторыя прыватныя будынкі. У некаторых мясцох вялікім напорам вады зьмыты дашчэнту пабудовы станцыі, Тэлеграфныя зносіны перарваны.

Для аднаўленьня руху мабілізаваны ўсе тэхнічныя сілы чыгункі. Паслана на дапамогу тры паязды, фармуецца яшчэ 7 дапаможных паяздоў. На месца катастрофы выехаў кіраўнік чыгункі т. Арцёмаў. Рух паяздоў спынен.

Ліўні ня спыняюцца, вада шпарка прыбывае, што вельмі перашкаджае барацьбе са зруйнаваньнем палатна. У некаторых мясцох чыгунка размыта на працягу 200 мэтраў. Страты вялічэзныя.

Весткі адусюль.

Працэс югаслаўскіх сялян.

ВЕНА, 14-VI. Абвешчан прысуд па справе 54 сялян, удзельнікаў сялянскага паўстаньня ў Бечкерэку (Югаславія) у лютым г. г. На судзе абвінавачаныя заявілі, што паказаньні іх на папярэднім дазнаньні былі вымушаны нечалавечымі катаваньнямі. 7 абвінавачаных засуджаны да зьняволеньня ў астрозе на час ад 3 да 6 гадоў, рэшта апраўдана.

Амундсэн у Токіё.

ТОКІЁ, 20-VI. Вядомы дасьледчык паўночнага канцавосься Амундсэн прыехаў у Токіё, дзе ён прачытае некалькі лекцый.

У Савецкай Беларусі.

С.-г. падатак.

Пры вучоце ёсьць хібы.

(Падсельскі с-с. Чамазіцкага р., Магілеўшчына).

З 5 чэрвеня па сельсавету распачаўся вучот аб'ектаў ападаткаваньня.

Трэба адзначыць, што сялянства адносіцца да вучоту з поўнай увагай, паказвае правідлова ўсе адзіны ападаткаваньня, але з боку вучотнай камісіі прыкмячаецца націск на колькасьць засеву ў таго ці іншага гаспадара. Дзеля таго, што сеазварот у нас трохпалёвы, трэба ўлічваць засеву дзьве часткі, а вучотная камісія начале са старшынёй РВК улічвала ня дзьве, а больш, хоць гаспадар і пераказваў правільна свой засеў.

З прычыны адсутнасьці корму, сялянс шмат жывёлы—кароў прадалі, але пры вучоце гэты продаж ня прымаўся пад увагу, а запісваўся лік кароў, які быў у мінулым годзе. Гэта выклікае з боку сялян незадаволеньні і скаргі (в. Шмакі).

Па тэхнічнай памылцы ў мінулым годзе ў аднаго гаспадара была дабаўлена 1 дзесяціна сенажаці, аб чым сельнін сёлета заявіў і прасіў камісію абмерыць і запісаць сапраўдную колькасьць зямлі, але вучотная камісія гэтага пад увагу не ўзяла і паслала селяніна да каморніка, каб ён абмерыў, што будзе каштаваць 10 рублёў.

У некаторых вёсках вучот праведзен вусім здавальняюча, але ў вёсцы Шмакі засталося яшчэ шмат укрытай зямлі, а вучот ужо скончан.

Там на надзел бралі 3—4 дзесяц. пахаты, а маморнік абмяраў у 1925 г. і вылявіў 7 дзесяцін з надзела, а так, як там каля 100 надзелаў, дык 300 дзесяцін ня ўлята на вучот.

Наогул, нобач з добрай працай камісіі ёсьць і хібы, на што трэба зьвярнуць увагу і зьнішчыць недахваты.

С.

Культурная вёска.

(Талачынскі р., Аршаншчына).

Новае сяло—адна з культурнейшых вёсак нашага райёну.

Яшчэ з 1923 году вёска перайшла на шматпольле і зараз сяляне вядуць дзевяціпольны севазварот.

У вёсцы ёсьць племянны бык і племянная матка і некаторы агульны сельска-гаспадарчы інвэнтар: малатарня з конным прыводам, велка, зьнямялка і 2 спружынавыя барны.

Сеткавую хату-чытальню, якая ёсьць у вёсцы, наведваюць амаль усе сяляне. Асабліва поўна ў хаце-чытальні ўзімку. Старыкі цэлымі днямі і вечарамі сядзяць над газэтамі, за гульнёй у шашкі. Пры хаце-чытальні наладжан стол справак.

Хатай-чытальняй выпісваецца 10 розных газэт і 7 часопісяў; ёсьць пры хаце-чытальні 2 гурткі і 1 куток (вайсковы). У сельска-гаспадарчым гуртку займаецца 10 чалавек, з іх 5 жанчын. С.-г. гуртком засеяны паказальны агарод у 3/4 дзесяціны. Сіламі драматычнага гуртка часта ставяцца спэктаклі.

Акрамя гэтага, х.-ч. выдае штомесячна насьценгазэту.

У Новым Сяле—адна з мацнейшых у Талачынскім раёне пажарная дружына, у якую ўваходзе 80 сялян.

Узімку ў вёсцы працавала вячэрняя школа сялянскай моладзі, у якой займалася 46 маладых сялян. Лікпункт скончыла 12 сялян. У аднакамплектнай школе навучалася 80 вучняў, што складае 75 проц. усіх дзяцей вёскі.

Ячэйка МОПР, існуючая ў вёсцы, налічвае 50 членаў, ячэйка «праф няпісьменнасьць»—24 чалавекі маецца таксама некалькі членаў ТДА Авіяхіму.

Ёсьць дасягненьні і ў галіне дабрабыту вёскі, вакол хат насаджаны дрэўцы, порыдымчна праводзіцца санітарны агляд вёскі.

У Новым Сяле знаходзіцца сельсавет, партыйная і камсамольская ячэйкі, пісьменатрад і група акцябрат.

Міхась Зан.

Мэліярацыя у межах былушай Барысаўшчыны.

Барысаўскую акругу з паўн-зах. на поўдзень прарозвае р. Бярэзіна, якая праходзіць праз 5 райёнаў і ў межах апошніх прымае да 20 прытокаў,—такім чынам р. Бярэзіна служыць галоўнай артэрыяй, зьбіраючай воды з балот акругі. У ведазборы кожнага з прытокаў маецца ад 5000 да 20000 дзес. балот.

Агульная плошча балот Барысаўшчыны складае 135267 дзес. альбо 12,4 проц. усёй плошчы акругі; гэта галоўная частка нашых балот,—гэта пераходныя і нізінныя.

Мэліярацыя ў нас начала праводзіцца толькі з 1925 г. па рэках Гайне і Цне.

Для прэвядзеньня мэліяраційных работ на гэтых рэках неабходна затраціць каля 700.000 руб., з іх 300000 руб. па дзяржбюджэту, а рэшта за рахунак самога насельніцтва.

Згодна пэрспэктыўнага плану работ, на мэліярацыі намечана яшчэ правесьці рэгуляваньне рэк Можа, Нача, Бобр, Клева, Клевіца і Есса, якія ў будучым змогуць служыць добрымі сплаўнымі артэрыямі.

Разам з работамі па мэліярацыі дзяржаўнага значэньня і за кошт дзяржавы, у нас з кожным годам напыраецца лік мэліяраційных таварыстваў і ў сучасны момант іх налічваецца 56 з агульнай плошчай у 9356 дзес. Частка мэліяраційных таварыстваў яшчэ ў 1926 г. праводзіла будаўнічыя работы, а 22 таварыствы гэтую працу будуць праводзіць у гэтым годзе на плошчы 3030 дзес.

Зацікаўленасьць з боку сялянства к мэліяраційным работам вельмі вялікая, але з-за недахвату тэхнэрсаналу і сродкаў немагчыма здаволіць усе запатрабаваньні сялянства.

Усяго па акрузе сёлета будзе працаваць 14 спэцыялістаў, галоўным чынам, студэнтаў Горы-Горацкай с-гасп. акадэміі і Менскага гідратэхнікума.

Культуртэхніка.

Работа па культуртэхніцы, а таксама і па гідратэхніцы ў нашай акрузе яшчэ зусім новая і яна толькі пачынае разьвівацца. З існуючых 56 толькі 6 мэліяр. таварыстваў зрабілі ўспашку і закладку паказальных вучасткаў, на якія было адпушчана насеньне і ўгнаеньне. Некаторыя таварыствы ў мінулым годзе атрымалі на сельскагаспадарчай выстаўцы прэміі за ўраджай з гэтых вучасткаў, што зьявілася значным штурхачом у далейшай працы і як вынікі ужо ў гэтым годзе частка таварыстваў за свае сродкі купляла насеньне і ўгнаеньне і самі рабілі ўспашку асушаных вучасткаў. Вялікага таксама запытаньне і на доўгатэрміновы крэдыт. К канцу пяцігадовага пляну мэліяраційнымі таварыствамі маркуецца асушыць 23000 дзес. і на 10 проц. асушанай плошчы будзе праведзена праца па закладцы шматгадовага лугу.

Торфараспрацоўкі.

Торфараспрацоўкі ў Барысаўшчыне пачынаюць зараджацца толькі з 1927 г. Недахват апалу як для сялян, так для фабрык і заводаў прымушае ў хуткім часе перайсьці на тарфяны апал. Сяляне адзіночкі яшчэ ў мінулым годзе дзе-ні-дзе саматужным спосабам дабывалі торф. Зараз маецца шмат заявак ад арандатараў паравых млынаў аб правядзеньні абсьледаваньня тарфяникаў для іх эксплёатацыі. На апошнім насяджэньні прэзыдыуму акрвыканкому дадзены дазвол набываць паравы млын, які будзе працаваць на торфе,—гэтае ў в. Ігрушка Крупскага райёну.

Тарфяных таварыстваў у нашай акрузе няма і ў сэзон 1927 г. маркуецца арганізаваць 4 такія таварыствы ў Чарэйскім райёне.

В. Зайцаў.

Шляхавае будаўніцтва.

(Чэрвенскі р., Жэнішчына).

Шляхоў райённага значэньня ў нас налічваецца сем. За гады вайны і рэвалюцыі яны канчаткова заняпалі. Адных мастоў трэба справіць 29. Ёсьць выпадкі, што коні ламалі ногі. Каштарыс райёну дазваляе адрамантаваць у гэтым годзе толькі тры. Кепска справа і з маматар'ялам.

Тут трэба адзначыць несьвядомыя дзікія адносіны да мастоў з боку самога насельніцтва. Часта на зусім спраўных мастох, якія нават маюць буйнае стратэгічнае значэньне, адбіваюцца гайкі, высякаюцца прысады і слупкі на гроблях. А сельсаветы глядзяць на гэта, спусьціўшы рукі.

Ня выносіцца агульных пастаноў. Адсюль, немажліва прыцягнуць таго, хто адмаўляецца ад працы.

Задараецца і тое, што дастаўка лесу з лясьніцтва абходзіцца 70 руб., а самы лесматар'ял 15 руб. Лясьніцтвам трэба больш чула падыходзіць да гэтага пытаньня.

Шляхі-ж дзяржаўнага і акруговага значэньня на тэрыторыі нашага райёну большаю часткаю ў парадку.

Н.

ВЕСТКІ З МЕСЦ.

Насеньне пацярпеўшым ад гурагану.

Бабруйск. Акр. сельсаюз разьмеркаваў 5.000 пуд. насеньня аўса на пізавой крэдытнай калаборацыйнай сетцы для продажу яго тым сялянам, поле якіх папярпела ад градабіцьця і ліўняў.

Агляд прамысловых прадпрыёмстваў.

Гомель. Рэдакцыя газэты «Полесская Правда» у пачатку ліпеня наладжвае прамадзкі агляд прамысловых прадпрыёмстваў. Па гэтаму пытаньню рэдакцыяй была склікана нарада рабкораў мясцовых прадпрыёмстваў і кіраўнікоў гаспадарчых устаноў. Рэдакцыяй апрацаваны агульны плян агляду які будзе разасланы на прадпрыёмствах.

Курсы для рабочай моладзі.

Горка. У Горках па ініцыятыве райкому КСМ адчыніліся курсы па падрыхтоўцы ў рабфакі і вайсковыя школы. Курсы разьлічаны на 2 месяцы. На курсы пададзена каля 100 заяў, залічана—35 чал.

З вясновых лістоў.

— Шляхі і масты ў Капыльшчыне р. у вельмі кепскім становішчы.

Па шляху Капыль—Васільчыцы—Лешня няма ніводнага маста і праезд асабліва ўпочы немагчымы.

Ня лепш справа і на трактах на Бабруйск, сл. Кучанку і Пясочнае.

У м. Капыль і Цімкавічы таксама па вуліцах сьвіцць нельга.

Пара падумаць аб шляхавым будаўніцтве. Шч.

— У в. Бардзілаўка [Кайкаўскі с. с. Самахвалавіцкі р.] летась арганізавана мэліяраційнае т-ва.

Зараз праўленьне пачыла ў Белсельбанку 1200 руб., закупіла 600 п. угнаеньня і заклала на плошчы 2 дзес. пасадальны вучастак.

Кулаком жа не па нутры гэта справа і яны хочуць не сарваць усялякімі спосабамі распаўсюджваюць чуткі, што скора прыдуць палякі, што старшыня растрацію ўрэмы (чаго няма на справе) і г. д.

Але камсамольцы з бяднякамі і серадняцкімі, ня гледячы на іхнюю зьвяту, пачалі і праводзяць працу, а ва нашай вёсцы ідуць і сяляне суседніх вёсак, і арганізуюцца ў т-ва. Сельнор Чулы.

— Дуліцкая кавэрацыя знаходзіцца на адлегласьці 3 вёрст ад Узьлянскай і з прычыны канкурэнцыі паміж імі Узьлянскай кавэрацыя за апошні квартал мела 1328 руб. дэфіцыту.

Патрэбна гэтыя дзьве кавэрацыі аб'ядаць у адну, што дасьць эканомію сродкаў каля 2000 р. у год. Бельнор.

Брытанскія мэтады: шпіёнаж і правакацыя.

(Ад уласнага карэспандэнта).

— Адной з дзьвюх краін, за якімі мы зараз наглядаем, СССР зьвяртае на сябе ўвагу вялікай часткі нашых найлепшых агэнтаў шпіёнажу, маючых перад сабой варты перайманьня прыклад шпіёна сэра Поля Дзюкса—прызнаецца Фэрдынанд Цьюгі, далёка не апошняя асоба брытанскае контрразьведкі. Артыкул гэты зьмешчан у адным з найбольш распаўсюджаных ангельскіх буржуазных часопісяў «Графік» 2-га красавіка г.г. Для большае наглядзнасьці да артыкулу прыкладзен партрэт «ідэальнага шпіёна» з красамоўным надпісам: «Сэр Поль Дзюкс, начальнік брытанскае контр-разведкі ў Савецкай Расеі ў 1918-19 г.г., нагароджаны ордэнам за сваю сакрэтную службу. Ён зрабіўся чырвоным камісарам, каб мець патрэбныя весткі»...

Коратка і ясна: шпіён-правакатар атрымлівае вышэйшы ордэн. Ці-ж гэта ня лепшы доказ, якая ганаровая назва правакатара?.. Ці-ж гэта ня лепшы прыклад, «варты перайманьня»?..

Падзеі хутка разгарнуліся і як ня трэба лепш даказалі словы брытанскага шпіёна—«СССР зьвяртае на сябе ўвагу вялікае часткі найбольш здольных шпіёнаў Англіі». Але, аўтар, як і трэба было чакаць, надзвычайна скромны: ён зусім не гаворыць аб мэтадах шпіянажу, аб тым, што гэты шпіёнаж ідзе роўнадзежна з другой працай—актыўным сабатажам—забойствамі, падпаламі, змовамі...

Між іншым, для сапраўднага брытанца ў гэтым няма нічога дзіўнага: падобная праца вялася, вядзецца і будзе весьціся да тае пары, пакуль існуе брытанская імпэрыя. Да тае пары гэтыя «ганаровыя» дзеяньні ўзнагароджваюцца і будуць узнагароджвацца ордэнамі. Мэтады старыя. 170 гадоў ужываюцца яны ў Індыі ад часу першага індуса правакатара і шпіёна Мір-Джафара, дзякуючы здрадніцтву і правакацыі якога 2-га чэрвеня 1757 г. ангельцы выйгралі бітву пры Плесі, аддаўшую ім у рукі ўсю Індыю. За гэтыя 170 гадоў ангельцы заснавалі цэлую школу новых Мір-Джафараў, якія прадаюць шматмільённы індыйскі народ, учыняюць забойствы, правакацыі, нацкоўваюць адно племя на другое, каб выклікаць міжпляменныя і міжрэлігійныя бойкі, кіруемыя вопытнай рукой лёндонскіх кіраўнікоў... 170 гадоў індыйскія Мір-Джафары і Дзюксы атрымліваюць узнагароды, тытулы і грошы...

Каля двох месяцаў таму назад група індусаў злавіла аднаго з такіх правакатараў і прымусіла яго даць паказаньні, апублікаваныя 2-га красавіка (супадзеньне: у той жа дзень, калі пісаў сваю «джалярацыю» шпіянажу Цьюгі) у калькуцкай газэце «Форуард». Там жа была прыкладзена яго надпіска—адказ і адрас.

Тыя-ж самыя мэтады практыкуюцца 100 з лішкам гадоў у Кітаі, 50 гадоў у Эгіпце і г. д. і г. д. і 10 гадоў у СССР. Правакацыі, забойствы, падпалы, змовы, шпіянаж,—плямкуючыя крыві, зарана пажараў, трупаў і руін—вось шлях, на якім пераможна ідзе брытанскі імпэрыялізм.

На гэтым фоне мільгаюць агідныя, брудныя, брыдкія твары нацыянальных здрадніка-юдаў: індыйскіх Мір-Джафараў, аравійскіх Гусэйнаў, эгіпецкіх Зіпараў, Адлі і Сарутаў, кітайскіх Чжан-Цзо-Лінаў, расейскіх Керанскіх, Урангеляў, Савінкавых, Фунцікавых, Канрадзі, Кавэрд, Даўгаруковых і Гурэвічаў, ангельскіх Поль Дзіксаў і Фэрдынандаў Цьюгі, ззаду якіх 170 год стаялі Кляйвы, цяпер—Чэмбэрлены, Біркэнхэды і Хіксы...

«Брытанскі ўрад заўсёды заставаўся верным сваім непарушным прынцыпам гуманнасьці і праўдзівасьці»...—нязьменна кожны дзень чуваць фраза—прагніўшы фігавы лісток, які павінен прыкрыць цынічную нагату брытанскай палітыкі..

Індыя, Кітай, Эгіпет, Турцыя, СССР... Колькі яшчэ краін, колькі народаў спрабавалі на сабе гэтыя «прынцыпы» гуманнасьці і справядлівасьці... Колькі яшчэ народаў пападзе ў гэты сьпіс чорных спраў брытанскага імпэрыялізму...

Малюнак гэтай страшна-агіднай працы далі цынічна адкрытыя мэмуары ангельскага генэрала Дэнстэрвіля, які ў 1918 годзе быў у Баку і ў Пэрсіі; той-жа малюнак даў працэс Фунцікава, актыўнага памоцніка ангельцаў у зьверскім забойстве 26 бакінскіх камісараў... Колькі гэткіх-жа малюнкаў даюць штодзённыя падзеі у Кітаі, Індыі, Эгіпце, Іраку, Пэрсыі і іншых краінах...

Характэрна яшчэ тое, што брытанскі ўрад заўсёды яраснa абвяргае свой удзел у гэтых нячыстых справах, але праз некалькі год ён сам прызнаецца, што ён учыніў падобныя зьверствы. «Гэта было даўно: мы змушаны былі так зрабіць... цяпер ня той час—мы больш гэтага ня робім»...

Пад сваю шпіёнскую працу трэба-ж падвесьці якую-небудзь падставу, «пацулярызаваць», каб яна атрымала належную ацэнку шырокіх мас, поўнай прапагандаваць яе. За справу гэту ўзяўся сам Фэрдынанд Цьюгі, наводзе якога мы вышэй цытавалі («Графік», 2-га красавіка): «Нельга паглядзець на карту пасьляваеннай Эўропы, каб ня ўбачыць пяць прычын—пабудзіцелаў узвоцненага разьвіцьця сучаснага шпіянажу» — бэзацэляцыйна рашае спэц.

Якія-ж гэта пяць прычын?

«Фашызм»,—адказвае ён—«Ліга Нацый» і... «імкненьні аднавіць страчаную манархію»... Гэтыя тры зьявішчы патрабуюць стварэньня сваіх шырокіх сыстэм шпіянажу, каб «быць ў курсе ўсіх міравых падзей».

Чацьвертая прычына: «Тэрыторыі, якія перайшлі ў новыя рукі»—яны вымагаюць асаблівай увагі новых гаспадароў, якія абяцаюць вылявіць у іх нацыянальныя тэндэнцыі...

І, урэшце, пятае «існаваньне» чырвоных—існаваньне СССР, за якім імпэрыялісты (а перш за ўсё, зразумела, Англія) «павінны зорка наглядаць».

Апошнія падзеі: Пекін і Аркос, Варшава, Менск, Ленінград і Масква паказалі ўжо нам, які гэта «зорні нагляд».

Вось чым апраўдваецца неабходнасьць ужываньня старых, непарушных мэтадаў і прынцыпаў «справядлівасьці і чалавекалюбства».

Вызначыўшы неабходнасьць існаваньня шпіёнажу і давёўшы, такім чынам, мэтазгоднасьць удзяліць усю сваю ўвагу працы ў СССР, аўтар бегла закранае пытаньне шпіёнажу фашыстаў ва Францыі (дзе, згодна яго заявы—зусім няма брытанскага шпіёнажу) і адразу-ж пераходзіць да «праблемы», але агаварваецца—«я не хачу нічога выказваць, што магло-б паняводзіць брытанскім інтарэсам... (О, мы нікольні на сумняваемся). Перад ім некалькі праблем, і першая з іх: «Ці варта цэнтралізаваць усю шпіёнскую працу ў адной асобе?».

«Я вельмі сумняваюся ў тым,—піша ён,—што мы прыняли цэнтралізацыю шпіёнажу пад кіраўніцтвам адной асобы, як гэта рабілі іншыя краіны. Больш мажліва, што нашыя органы (адміраляцейства, управа авіяцыі і вайсковае міністэрства) дзейнічаюць таксама, як і раней, паасобна, але аб шпіёнах пісалі так многа вымыслаў, што мне здаецца, у гэту справу трэба ўнесьці хоць лёгкі карэктыў...».

Шпіёнская частка зьяўважана вымысламі, абражанае самалюбства шпіёна загаварыла ў ім, і ён узяў усю шпіёнскую братву пад сваю ахову. Выцдам выпадкова ён траіцць думку, што «шпіёнаж караецца зьняволеньнем на тры гады», каб не астудзіць пыл у будучых калег, якіх, галоўным чынам, і тычыцца гэты артыкул. Паскардзіўшыся на «цяжкую долю шпіянажу» ён, аднак, тут-жа паведамляе, што шпіёнам плацяць за паслугі па 100 і больш руб.

З чаго-ж складаюцца яго карэктывы? У стройнай сыстэме шпіёнажу, якую аўтар прыводзіць, відавочна, для будучых сваіх памоцнікаў: «вось табе, выбірай»...

«Шпіёнаж вядзецца вельмі скрыта на кожнай паасобнай краіне: па СССР, Францыі, Нямеччыне і г. д., як я адзначаю ў гэтым прыкладзе». Далей ідзе схэма разьмеркаваньня ш

Чырвонаармейцы культурнай рэвалюцыі.

(3-ці выпуск Пэдфаку БДУ).

ШКОЛА І НАСТАЎНІК—У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ПАРТЫІ.

Усе сілы на служэньне савецкай дзяржаве.

21-га чэрвеня ў клюбе імя Карла Маркса адбылася нязвычайная ўрачыстасьць—3-ці выпуск Пэдфаку БДУ.

Урачысты сход адчыніў нам. рэктара БДУ тав. Слонім.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАЛЕТАРСКУЮ ІДЭАЛЁГІЮ.

— Мы спадзяёмся,—кажа т. Слонім, што выпускнікі будуць высока трымаць слаўны сьцяг БДУ. Вы справіцеся з той надзвычайна адказнай працай, якая ўскладзена на вас. Зараз, як ніколі, вы павінны ведаць сур'ёзнасьць міжнароднага становішча. І яшчэ, як ніколі, трэба вам ведаць, што ніякімі нагрозамі ворагі не перашкодзяць нам весьці далейшую напружаную працу. Сёньнешні выпуск—найлепшы прыклад гэтага.

Тав. Слонім вызначыў асноўныя задачы, якія стаяць перад маладымі пэдагогамі:

— Выхоўваць з моладзі добрага савецкага грамадзяніна і барацьбіта.

— Змагацца за пралетарскую ідэалёгію.

— Усе сілы і веды аддаць на культурнае ўзьнясьце беларускай краіны.

ДРУЖНАЙ СЯМ'ЁЙ—НА КУЛЬТУРНЫ ФРОНТ.

Ахарактарызаваў выпускнікоў у сваёй прамове праф. **Пятуховіч.**

Сёлета Пэдфак скончылі 298 чалавек. Большасьць з іх скончылі гістарычнае аддзяленьне (145 чал.), далей ідуць прыродазнаўцы (63 ч.), літаратурнікі (56) і, урэшце, матэматыкі (34). Дакладчык падрабязна спыніўся на сацыяльным стане выпускнікоў: 79 з іх—сяляне, 27—рабочых, рэшта служачыя і дзеці працоўнай інтэлігэнцыі.

— Мы маем поўную надзею, што выпускнікі ўвальюцца ў армію асьветнікаў дружным атрадам, каб узмацніць наступ на франтох культурнай рэвалюцыі,—закончыў сваю прамову прафэсар.

У часе ўрачыстасьці ў залю ўвайшлі: генэральны сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын, народны камісар асьветы т. Баліцкі і загадчык аддзелу друку пры ЦК КП(б)Б т. Сянькевіч.

Заля спаткала гасьцей шумнай авацыяй.

Прамова тав. Кнорына.

— Папершае, дазвольце вам, усім студэнтам выпускнікам, перадаць нашае братэрскае камуністычнае прывітаньне і пажадаць посьпехаў у вашай надзвычайна адказнай і важнай працы. Мне прыходзілася бачыць ваш Беларускі Унівэрсытэт у першыя гады яго існаваньня.

У тыя гады ўся яго студэнцкая маса мала перавышала тую лічбу, якую сёньня выпускае Пэдфак.

Мінула 6 год—і мы выпускаем каля 300 студэнтаў з аднаго толькі пэдагагічнага факультэту.

Ваш унівэрсытэт вырас, зрабіўся савецкай вышэйшай навучальнай установай. Каб атрымаць вышэйшую адукацыю, каб утварыць вышэйшую школу патрэбна была сур'ёзная праца [illegible] прафэсароў, выкладчыкаў і студэнтаў. Дзякуючы гэтай працы, дзякуючы дапамозе дзяржавы, унівэрсытэт [illegible] параўнаўча кароткі тэрмін зрабіўся навучальнай установай, якая карыстаецца вялікай папулярнасьцю, якая [illegible] здабіць вялікі ўплыў на маладое [illegible] леньне.

Атрыманыя веды дадуць вам магчымасьць арыентавацца ў тых складаных палітычных абставінах, ў якіх вам прыдзецца працаваць.

Некалькі слоў адносна нашага студэнцтва. Наша беларускае студэнцтва, як і студэнцтва іншых савецкіх унівэрсытэтаў, адрозьніваецца ад студэнцтва буржуазных навучальных устаноў. Чырвонае студэнцтва прыходзіць з нізоў, ад іх яно прыносіць свой багаты жыцьцёвы вопыт. Гэта-ж студэнцтва па скончэньні курсу навучаньня зноў вароча́ецца да нізоў, непрадае ім набытыя веды.

У культурна адсталай савецкай Беларусі ваш атрад будзе мець вялікае культурнае значэньне, і перад вамі стаяць вялікія задачы. Прыйшоў час, калі можна ўжо загаварыць аб культурнай рэвалюцыі, аб перабудове адносін паміж людзьмі. Гэта задача патрабуе шмат часу, шмат энэргіі, шмат упартай працы. Параўнаўча лёгка ўдалося нам перамагчы буржуазею і ўзяць у свае рукі ўладу. Таксама параўнаўча хутка ўдалося нам узьняць эканамічнае становішча нашай краіны. Культурная рэвалюцыя патрабуе ад нас большай напружанасьці, большай энэргіі.

Рабочая кляса за апошнія гады палітычна і эканамічна так узмацнілася, што зараз яна можа перайсьці да распрацоўкі культурных і ідэалёгічных пытаньняў. Рабочыя пасьпелі нагэтулькі, што могуць дазволіць сабе заняцца культурным будаўніцтвам.

У спадчыну ад буржуазеі мы атрымалі вялікі культурны вопыт, але ў большасьці гэты вопыт зьяшчае ў сабе аджыўшыя буржуазныя забабоны, буржуазную ідэалёгію. Задача маладога пакаленьня—зьнішчыць гэтыя забабоны і асьветліць атрыманы вопыт ліхтаром марксізму.

Наша партыя, рабочая кляса ўсьвядомілі марксісцкі мэтад; дзякуючы яму мы знашлі мэтад, мы знашлі шляхі да Кастрычнікавай рэвалюцыі. Мы ўявілі сабе, як трэба перамагчы нашых ворагаў, як трэба арганізаваць масы для гаспадарчага будаўніцтва, для ўздыму эканомікі.

Мы поўнасьцю пераможам і на культурным фронце. Грозныя хмары на Захадзе, мы ўпэўнены, ня могуць перашкодзіць нашаму будаўніцтву, нашай працы. Няма такой сілы—мы цьвёрда ўпэўнены ў гэтым—якая здолела-б спыніць перабудову жыцьця чалавецтва.

Значная частка выпускнікоў пэдфаку будзе працаваць у якасьці настаўнікаў. Мы лічым, што праца па выхаваньні маладога пакаленьня на новых асновах, на прынцыпах камунізму, надзвычайна важная і адказная. Выкладаньне ў нашай школе павінна весьціся ў інтарэсах перамогі сацыялізму, у інтарэсах пралетарыяту. Сярод вас ёсьць група таварышоў, якія ў будучыне зойміцца выкладаньнем грамадзкіх навук. Грамадзкія навукі ў нас пакуль што ў загоне. Заняткі вядуцца так, што яны ня могуць зацікавіць слухачоў—гэтаму перашкаджае недахват настаўнікаў-грамадазнаўцаў.

Сёньнешні выпуск павінен аддаць усе свае сілы, усе свае веды на тое, каб грамадзкія навукі занялі пачэснае месца ў грамадзкай школе.

Наша школа пакуль-што небагата; становішча настаўнікаў не адпавядае тым вялікім задачам, якія ўскладзены на яго. Але мы цьвёрда ўпэўнены ў тым, што з кожным годам будзе паляпшацца становішча культурнага працаўніка, будзе расьці грамадзкая роля і значэньне настаўніка і школы.

Выходзячы на працу, вы павінны памятаць, што школа і настаўнік будуць у цэнтры ўвагі партыі і рабочае клясы.

Памятайце, што ў сьвеце ёсьць толькі адна дзяржава, за якую варта жыць і памерці—гэта рабочая савецкая дзяржава, што ў сьвеце ёсьць толькі адзін штандар, пад якім варта змагацца—гэта сьцяг камунізму (доўгія воплескі).

З-ці ВЫПУСК ЗДАВОЛІЦЬ ПАТРЭБЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ШКОЛЫ.

Ад імя Народнага Камісарыяту Асьветы выпускнікоў вітаў т. Баліцкі.

— Новыя кадры маладых настаўнікаў зараз з бадзёрасьцю паняясуць свае веды ў гушчы працоўных мас. Гэты трэці выпуск Пэдфаку мае асабліва важнае значэньне для нацыянальных школ, якім патрэбны новыя працаўнікі. Гэты-ж выпуск у значнай меры здаволіць попыт на сьвежыя кадры настаўніцтва ўогуле.

Далей, тав. Баліцкі спыніўся на шпаркім росьце культуры ў БССР і на тых задачах, якія стаяць перад выпускнікамі ў галіне гэтай культуры.

ЧЫРВОНАЕ СТУДЭНЦТВА ЗМОЖА ВЫБІЦЬ ЗДРАДНІЦКІЯ РЭВАЛЬВЭРЫ.

Паралель паміж дарэвалюцыйным студэнцтвам і сучасным чырвоным правёў у сваім прывітаньні старшыня ЦП саюзу асьветы **т. Платун.**

— Чырвонае студэнцтва зможа даць «на руках» Кавэрдам, зможа выбіць з іх рук здрадніцкія рэвальвэры.

Сваю прамову т. Платун закончыў заклікам, каб новыя пэдагогі прынялі актыўны ўдзел у жыцьці прафсаюзу.

Шумную авацыю наладзілі выпускнікі **прадстаўніку Чырвонай арміі т. Кандрашову.**

Магутнае «ура» пакрыла лёзунг—«Няхай жыве слаўная Чырвонае армія».

ВЁСКА ЧАКАЕ НОВЫХ КУЛЬТУРНЫХ СІЛ.

Прысутнічалі на ўрачыстасьці і прадстаўнікі сялян,—тых сялян, сярод якіх будзе працаваць студэнцтва.

У сваёй прамове селянін падшэфнай пэдфаку вёскі. **т. Гладкі** так і сказаў, што вёска напружана чакае новых культурных сіл.

СЬЦЯГ БДУ ПАДТРЫМАЕМ.

З адказам на прывітаньні выступіў **т. Рабцаў.**

— Сьцяг БДУ падтрымаем, вось галоўнае яго адказу.

* * *

Сход паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б і ўраду БССР.

За працу, за цяжкую працу на будаўніцтву сацыялізму возьмецца гэты атрад чырвонаармейцаў на культурным фронце.

Ян. Садоўскі.

ПАДПІШЭЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА

— НА ГАЗЭТУ —

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

на 2-ое паўгодзьдзе 1927 г. ліпень-сьнежань.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 1 месяц — — 70 к. На 3 месяцы 2 р. —
» 2 » 1 р. 40 » На 6 месяцаў 4 р. —

За дадатковыя 40 кап. у месяц кожны падпішчык можа атрымаць часопісь **«Маладняк»**—кніжку ў 6 друкаваных аркушаў (100 стар.), якая даецца, як платны дадатак да газэты.

Газэта **«Савецкая Беларусь»** разам з часопісьсю **«Маладняк»** — 1 руб. 10 кап. у месяц.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты—рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—ва ўпаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддз. Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

Жыцьцё і праца асьветніка.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА 27-28 НАВУЧ. ГОДУ.

(За нармальны навучальны год у вясковай школе).

Бягучы навучальны год амаль канчаўся. Зараз праводзіцца падлік працы за год. Скора можна будзе зрабіць пад'агуленьне працы ва ўсіх асьветных установах, заўважыць усе добрыя і адмоўныя бакі, каб апошнія выправіць к наступнаму году.

Разам з заканчэньнем бягучага навучальнага году мы павінны рашуча паставіць пытаньне аб падрыхтоўцы да наступнага году.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што несвалячасовая падрыхтоўка да пачатку навучальнага году значна адбіваецца на вытворчай працы школы, асабліва ў масавай вясковай, дзе рознае адчыненьне заняткаў скарачае і без таго карсткі (100-120 дзён) вучэбны год.

Свалячасовая падрыхтоўка да пачатку наступнага вучэбнага году вымагаецца яшчэ і тым, што пачатак заняткаў у масавай пачатковай школе ў гэтым годзе пераносіцца з 1 кастрычніка, як гэта было раней, на 15 верасьня.

Народнаму Камісарыяту Асьветы добра вядомы сялянскія ўмовы, дзе дзеці зьяўляюцца дапаможнікамі сваім бацьком у гаспадарцы і прыходзяць у школу, як выпадзе сьнег. Але ў гэтым годзе мы павінны рашуча паставіць пытаньне аб павялічэньні вучэбнага году ў вясковай школе.

Гэтае пытаньне абгаварвалася на нарадзе па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня, якая адбывалася 28-30 сакавіка г. г. і пастанавіла заняткі ў вясковых школах пачынаць 15 верасьня. Гэта пастанова нарады зацьверджана Наркамасьветы і будзе праводзіцца ў жыцьцё.

Зразумела, што ажыцьцяўленьне гэтае пастановы вымагае ад кіруючых устаноў і асобных працаўнікоў у галіне народнае асьветы і асабліва ад акруговых і райённых інспэктароў—уважлівых адносін да свалячасовае падрыхтоўкі да пачатку наступнага навучальнага году.

Галоўная і першачарговая праца з боку акруговых і райённых інспэктароў народнае асьветы павінна быць выяўлена ў наступным:

1. Закончыць укамплектаваньне школ настаўнікамі да 1 жніўня ў старых школах.

2. Усе настаўнікі школ, апрача нова адчыняемых, павінны быць на сваіх мясцох к 15 жніўня і на працягу месяца закончыць падрыхтоўчую працу да свалячасовага пачатку заняткаў у вясковых школах з наступным навучальным годам.

3. Наём прыватных памяшканьняў для школ і рамонт дзяржаўных будынкаў закончыць да 1-га верасьня, а разам з гэтым забясьпечыць усе школы апалам.

Ня гледзячы на шмат напамінкаў аб гэтым у мінулыя гады наём і рамонт будынкаў адцягваў пачатак заняткаў, а адсутнасьць паліва зрывала заняткі ў школах. Хоць гэта былі рэдкія выпадкі, але ў 27-28 вуч. годзе такіх выпадкаў не павінна быць.

4. Свалячасовае забясьпячэньне школ падручнікамі і пісьмовымі прыладамі павінна стаяць не на апошнім месцы.

Беларускаму Дзярж. Выдавецтву трэба паклапаціцца, каб свалячасова выпаўніць усе заказы акругаў і райёнаў на падручнікі, пісьмовыя прылады к тэрміну.

Ад выкананьня усяго вышэйпамянёнага многа залежыць пачатак і нармальная праца у школе.

Ня менш важная і найцяжэйшая справа гэта ўцягненьне дзяцей у школу. Тут адным складам асьветных працаўнікоў справіцца вельмі цяжка, але за **нармальны навучальны курс, нармальны навучальны год і нармальны навучальны дзень** у вясковай пачатковай школе настаўнік павінен быць ініцыятарам і актыўным удзельнікам яго ажыцьцяўленьня.

На гэта трэба зьвярнуць шмат увагі настаўнікам акруговых настаўніцкіх курсаў, каб падрыхтаваць і ў час правядзеньня райённых настаўніцкіх канфэрэнцый уцягнуць усіх асьветнікаў у правядзеньне падрыхтоўкі і самой працы ў школе над вышэй памянёнымі лёзунгамі.

Папулярызацыяй нармальнага навучальнага году ў вясковай школе, асабліва пачаткам і заканчэньнем яго, добра было-б каб зацікавіліся ўсе савецкія, партыйныя, прафэсыянальныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі і найсьці на дапамогу асьветным установам у ажыцьцяўленьні лёзунгу «Нармальны навучальны год у вясковай школе».

У жніўні месяцы і пачатку верасьня будзе праведзена кампанія у друку за нармальны навучальны год ў вясковай школе, у якой неабходна будзе, каб прынялі актыўны ўдзел усе працаўнікі асьветы і зацікаўленыя арганізацыі.

Аніхоўскі.

Паднімаем прадукцыйнасьць.

З лекцыйнага на лябараторны мэтад.

(Чэрвенская сямігодка).

Чым далей, тым усё больш і больш лекцыйны мэтад выкладаньня не задавальняе як настаўніцтва, так і вучняў. Тут вучань пасыўна ўспрыймае тыя веды, якія падносіць яму настаўнік. Вучань ня вучыцца самастойна працаваць. Ініцыятыва і самадзейнасьць, якая зараджаецца ў дзіцячыя гады, канчаткова адмірае. Больш здольным вучням няма работы, а слабыя працяць усякую веру ў свае сілы і атрасаюць рукі.

Толькі «раздольле» аднаму настаўніку. Колькі і чаго ён не перагаворыць за кожны навучальны год! Адсюль ня дзіва, што ў старой школе ў настаўніцтва гарлавыя сухоты займалі першае месца пасьля сухот грудных і кішачных.

Як-бы добра ні стаяла справа, немажліва вучня напоўніць ведамі хоць на некалькі гадоў. Трэба навучыць яго самога працаваць над кнігай, самому здабываць патрэбныя яму веды.

Усё гэта паставіла нашу 1-ю Чэрвенскую сямігодку перад пытаньнем аб пераводзе з наступнага году II канцэнтру на лябараторны мэтад.

Добры двухпавярховы гмах-будынак, паляўнасьць па кожнаму прадмету аднаго, а то і двух настаўнікаў; досыць багаты фізычны і прыродазнаўчы габінэт, значная колькасьць розных карт табліц і інш,—усё гэта складае добрую глебу для пераходу на новы мэтад.

Але разам з тым на шляху стаіць і цэлы шэраг перашкод, як многалюд насьць школы (да 700 вучн.), звышмаксымальная нагрузка клас (па падліку пры пераводах у V клясах па 51-52 ч., у VI—56 ч., у VII—38 чал.), неадпаведны разьмер лябараторый, недахоп і непрыгоднасьць клясных мэблі, недахоп падручнікаў для вучняў.

На ўсё гэта патрэбны сродкі, а школа іх ня мае.

Адсюль, каб даць мажлівасьць працаваць па лябараторным мэтадзе, РВК неабходна ў першую чаргу адчыніць 4-ю раўналежную V клясу і 3-ю—VI клясу. І пры такіх умовах у V кл. будзе па 38-39 вучн. і ў VI кл. па 37-38 вучн.

У некаторых сямігодках Беларусі гэты мэтад практыкуецца. Трэба апошнім на «Старонцы асьветніка» падзяліцца сваім вопытам, канкрэтна вызначыць дасягненьні і якім шляхам яны здабыты; указаць на адмоўныя бакі працы, каб мець мажлівасьць зразу ўхіліцца іх.

Г. В.

Дзьве справаздачы.

(Пухавіцкі райён, Менск. акр.).

I.

«Избиение младенцев».

Гэтымі днямі райвыканаўчы камітэт быў увесь дзень заняты выслухоўваньнем справаздач аб гадавой працы Навасёлкаўскай і Пухавіцкай сямігодак.

Увайшоўшы ў габінэт старшыні выканкому, дзе мела быць пасяджэньне прэзыдыуму, зразу кідаецца ў вочы шмат малюнкаў, дыяграм, схэм, спыткаў з творамі вучняў, якія (пэўна працы ня вучняў) часткаю віселі на сьценах, а часткаю былі раскіданы па стале. Гэта вынікі цяжкай гадовай працы вучняў Навасёлкаўскае сямігодкі; спыткі і малюнкі папалі сюды для ілюстрацыі к дакладу загадчыка школы.

Званок старшыні.

Першае слова для дакладу атрымаў загадчык Новасёлкаўскае сямігодкі.

— Дык, бязумоўна, таварышы, Новасёлкаўская сямігодка—кажа загадчык яе—ад мінулых гадоў атрымала няпрыемную спадчыну. Былы загадчык вучняў з клясы ў клясу перацягваў прама за вушы і мала лічыўся з тым ёсьць ці няма ведаў у вучня. А пагэтаму мы пры пераводах з клясы ў клясу і пры выпуску ў гэтым годзе аднесьліся «сур'ёзна».

Пагляд зім «сур'ёзныя» адносіны да вучняў Навасёлкаўскай сямігодкі. Пры пераводзе ў шостую клясу з пятай пакінута на другі год 23 вучні з агульнага ліку 52, а з сёмай клясы з 17 чалавек выпушчана толькі 8.

— У нас гэтым годзе было «избиение младенцев»—на вуха шэпча мне настаўніца той-жа сямігодкі.

У другіх клясах таксама процант пакінутых на другі год вельмі вялікі.

Як быццам ва ўсім вінават былы загадчык.

Пакінем мы старую прывычку лаяць некага: больш крытычнай апэнкі сваёй працы.

Як было відаць з дакладу, самакіраваньне ў сямігодцы не разьвернута ва ўсю шырыню, і настаўнік яшчэ непасрэдна ў вучнёўскім жыцьці адыгрывае надта значную ролю. Настаўнік яшчэ наводзіць на вучня належны «страх».

— Чарговы настаўнік—кажа загадчык сямігодкі—як выйдзе на калідор, дык зараз-жа ўтвараецца «парадак» і зьнікае пыл.

Цікава, што ў Новасёлкаўскай сямігодцы робяць клясныя старасты, сан. камісіі, члены вучкому і г. д.?

Між іншым у гэтай жа сямігодцы надта добра стаіць справа з скарыстаньнем школьнай зямлі, якая за мінулы год дала звыш 130 руб. чыстага прыбытку. Зямля апрацоўваецца амаль што выключна сіламі самых вучняў. Таксама шмат прыладаў для фізычнага габінэту зроблена вучнямі.

Адным чынам, ня гледзячы на шэраг дробных недахопаў у працы, настрой у Навасёлкаўскай сямігодцы працоўны, школа культурна расьце і завоўвае сярод мясцовага насельніцтва ўсе больш і больш сымпатыяў.

II.

„Саматужнікі“.

Без перапынку пасяджэньне перайшло да заслухоўваньня справаздачы загадчыка Пухавіцкай сямігодкі, які зьявіўся, ня ў прыклад Навасёлкам, з меншым жмукам паперы і ілюстрацыйных дакумантаў з сабою ня прынёс.

— У мінулым навучальным годзе—пачаў сваю справаздачу загадчык—у школе вучылася 377 асоб і з якіх значная большасьць з вёсак. Ёсьць вучні нават за 25-30 вярст. Цяга сялянскіх дзяцей у сямігодку надта вялікая. З гэтай прычыны існавала пятая раўналежная кляса. У наступнаючым навучальным годзе неабходна захаваць гэтую раўналежную і адчыніць шостую раўналежную. З дзьвёх пятых клас агульнага ліку 90 вучняў на другі год пакінулі толькі 12 асоб; з шостай у сёмую перайшло ўсе 100 проц.; з сёмай клясы выпушчана 26 вучняў і 5 засталіся на паўторны курс. Мы ў гэтым годзе маем павышэньне прадукцыі на 20,5 проц., а ў сэнсе павышэньня ведаў у вучняў маем больш, чым на 45 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Значная частка настаўніцтва другога канцэнтру працуе па прыбліжанаму дальтонаўскаму-лябараторнаму пляну, пры чым вынікі вельмі здавальняючыя, што заначылі нават інспэктар сацыяльнага выхаваньня з акр. АНА т. Кравякоў і нам. загадчыка акр. АНА т. Серафімаў. Школа адчувае недахоп у навучальных прыладах і дапаможніках, а таксама не хапае абсталяваньня. Вучнёўскае самакіраваньне настаўлена надта шырока. Я раіў бы выканкому заслухаць справаздачы вучнёўскага камітэту.

Вось кароткі зьмест справаздачы Пухавіцкае сямігодкі і гэта ёсьць сапраўдны адбітак працоўнага твару школы.

Пасьля справаздачы пачаліся пытаньні, якіх было вельмі мала. З іх толькі адно зьвяртае на сябе ўвагу.

— Ці здавальняюць запатрабаваньням сучаснае школы вашы настаўнікі—дае пытаньне адзін з удзельнікаў пасяджэньня.

— Бязумоўна—чуем адказ загадчыка; але ёсьць у нашай сямігодцы чатыры добрыя настаўнікі: двое скончыўшыя пэд. фак., а двое скончыўшых пэд. тэхнікум, ну і працуюць вельмі добра, надта энэргічныя, ня так, як саматужнікі...

І выходзіць нейкі новы падзел настаўнікаў: на саматужнікаў і несаматужнікаў, як бы ўжо сапраўдных настаўнікаў.

Дык нашто-ж тады гурткі па падвышэньні кваліфікацыі, нашто існуе самаадукацыя, курсы па перападрыхтоўцы? Мне думаецца, пытаньне трэба паставіць так: ці адпавядае свайму месцу настаўнік, які вядзе выкладаньне тэй ці іншай галіны навукі ў школе.

Пухавіцкая сямігодка за апошнія гады ва ўсіх галінах значна вырасла і шпаркім крокам ідзе наперад. Пры складаньні каштарысу на 1927-28 год неабходна будзе пагаварыць аб тым, каб трохі больш сродкаў удзяліць на навучальную і вучэбную частку. Сярод сялянства сямігодка карыстаецца значным аўтарытэтам.

Дзьве сямігодкі—дзьве вышыні ў райёне, якія ў далёкія куткі кідаюць чырвоныя прамені асьветы.

Сусед.

Дзейнасьць Цэнтральнага Дому Асьветы.

Каштарыс Цэнтральнага Дому Асьветы ў Менску складае каля 26.000 р. у год. Аднак матар'яльнае забясьпечаньне дому даволі дрэннае. Зараз дом мае доўгу 5.500 р., а іх 3000 р. пягнецца ўжо больш 2 год.

У праўленьне дому ўваходзяць 14 асоб: 7 настаўнікаў, 1 дашкольніца, 1 прафэсар, 2 тэхнічныя працаўнікі, 1 клюбны працаўнік і 2 канцэлярысты. Амаль усе абраныя таварышы вельмі перагружаны як асноўнай, так і грамадзкай працай.

У галіне масавай працы праведзена: 9 лекцыяў на розныя тэмы, 12 дакладаў, 5 дыспутаў, (з іх два аб Ясенініе), 23 спэктаклі, 15 канцэртаў, 39 кіно-пастановак (з іх 9 бясплатных), 2 палітсуды, 3 дзіцячыя раўнішнікі, 3 літаратурныя вечары, 4 пастановкі жывой газэты і 4 экскурсіі. Аднак трэба зазначыць, што гуртковая праца менш удала, чым масавая. Новая форма самаадукацыі працы сярод настаўніцтва Менску не пагыбілася. У працягу году ўсе гурткі распаліся, дзякуючы адсутнасьці кіраўнікоў і часткова памяшканьня.

Дом асьветы яднае 1123 члены, але 55 проц. зьяўляецца неакуратнымі плянцельчыкамі сяброўскіх узносаў. У пераважнасьці дом асьветы наведваюць студэнты і скарыстоўваюць чытальню бібліятэкі, як вучэбны пакой. Масавік асьветнік наведвае дом толькі на масавых вечарох і на платных спэктаклях і канцэртах.

Гурткавой працы ў доме нішкай няма, за выключэньнем гурткоў фізкультуры. Арганізаваныя пры доме палітгурткі не працавалі. Ленінскі куток займае вельмі маленькі пакой, куды фактычна ніхто ня ходзіць.

ОН. ТУРГАН.

Драма ў Шарэпаў.

Розныя мэты ў жыцьці бываюць і пароўнаму людзі ідуць да сваіх мэтаў. Хто напружанай барацьбой даходзіць да яснае мэты, а іншы—«рукі ўгору» а другой гадзіне ночы, калі поўная ўражаньняў ад апэрэты варочаецца цёмнымі завулкамі дамоў Манька ці Дунька ў паліце з коцікавым каўнерам. «Рукі ўгору», пальто з плячэй, і зьдзяйсьняецца мэта недзе ў віўной.

А Ліза зусім іншую мэту мела, гэткую звычайненькую мэту і то восем год таму назад. Была яна тады наўпашчокаю жартаўніцай, а цяпер запалі поўныя шчокі, маніліся шэрым пылам вяснушак, і грудзі, некалі высокія ды пышныя, стухлі, і ўся яна шчарнела, выліняла неяк. Некалі доўгая каса гойдалася, кучаравілася. А ўся мэта яе была—двухспальны ложак і малады муж. Гэта было так прывабна. Бацька—суровы дзячок з царквы „Нечаянная радость“ не паставіць на каленкі ў куток, не напяпяе за косы за чарнявага Пецьку. А Пецька абымаў горача, у сад месцавы вадзіў, абяцаў пасватацца, толькі прасіў мачкаць. Не, не чакала. Цягнула мэта, вабіла. Сукні насіць будзе новыя, модныя, капялюшы прыгожыя. А Пецька—фабрычны. Толькі і таго, што ира палітыку шмат гаварыў.

Сватаўся Міша Шарэпа, прыказчык з галянтарэйнага магазыну. Парфумай парфумаваўся, у ручку цалаваў і з айцом сальдіня размовы вёў. Хто яго ведае, якая ў яго душа,—адзяваўся шыкозна і грошы меў.

Гэтак восем год таму назад зьдзейсьнілася мэта. Стала Ліза—Шарэпаваю.

У цесным доміку, за двама вокнамі—вырокі двухспальны ложак. А ў кухні—адно акно над наветкі. Цёмна ў кухні.

* * *

І мінула восем год. Любові ня было, быў ложак; кухня яшчэ была, а праз год—Валя-сын. Сукнаў, капялюшаў і падобнага іншага ня было, была рэвалюцыя. І ненавідзеў жа яе Міша—галянтарэйнага ня стала.

І Ліза ненавідзела. Была вайна, голад, барацьба нейкая была. Гэта ўсё было нікавае, варожае, бо зьмятала вон усё—і сукні, і капялюш, толькі ложак не закранула. Стаяў ён. Восем год прастаяў; замяшчаваўся матрац, спружыны навылазілі, усё ўмірала.

Настаў НЭП. Места ўпрыгожвалася, вітрыны застракацелі...Міша ў Цэрабкоп рахункаводам на службу паступіў; плата—52 рублі з капейкамі. Убогенькія сукні справіў Лізе і капялюш тайны. Прыбралася Ліза, зажадала ў цэнтры пагуляць, а Міша «стоп» сказаў:

— Няма чаго чаравікі драць ды на суб'ектаў вачыма страляць!

Моўчкі распранулася.

Міша хоць і маленькі чалавек, і на службе надлізьнік, але дома бязьмежны ўладар. Ложак, кухня і Ліза з Валей—гэта яго недатыкальная ўласнасьць. Ніколі ня сумняваўся Міша, што гэта ўласнасьць не павінна мець ніякіх жаданьняў. Ложак можа стаяць на іншым месцы ў пакоі, калі ён пересуне яго, Ліза ў кухні абед варыць будзе, калі ён грошай ёй дасьць на прадукты, і спаць Ліза ляжа, калі ён скажа, і ўстане, калі загадае. Валя ілакаць будзе, калі ён яго наб'е, і сьмяяцца будзе, калі цукерак дасьць.

Дома пасьля службы Міша вылічваў, колькі канфет пракшта за дзень. Гэта была яго ўлюблёная работа. Скончыўшы вылічэньні, іграў з Лізай у 66. Казаў загадкі:

— Сёньня ты будзеш мець дзесяць «шубок».

Ліза накорна расьцягвала выцьвілушыя вусны.

— Я ябе ведаю. Толькі сёньня набачным.

І бязумоўна атрымлівала 10 «шубок».

І гэтак жыцьцё было разрахавана, размерана, як гадзіньнік. І Міша быў упэўнены у сабе.

Ліза ў цэнтры места бывала толькі тады, калі даводзілася што-небудзь купляць. Купляў усё Міша.

Яна толькі хадзіла і глядзела.

Жыцьцё ішло роўна. Міша быў стакойны.

Можа б так і прайшло б жыцьцё, і дажыла-б Ліза да старасьці, вырасла-б на барадзе некалькі бародавак, памерла-б, і пахавалі-б яе на цьвінтары ля царквы «Нечаянная радость», але неспадзявана Міша разрозаў палец. Пашоў на службу, а Лізе закамандаваў купіць яму іоду.

Хутка ішла Ліза да аптэкі, асьцярожна абмінала калюжы, і зашыпелася каля чыгуначнай лініі. Паволі ехаў таварны цягнік. Яна любіла прапушчаць вачыма вагоны, пагляддзець на машыністага, кандуктораў.

Цягнік набліжаўся. Перахіліўся з паравозу машыністы, уважліва глянуў на яе і рантам крыкнуў:

— Ліза!.. дабрыдзень!.. Тут?.. Дзе жывем?..

— Лысая-Гара, дом нумар... Пецька... Пецька...

Ён бліснуў зубамі з-пад чорных вусоў. Зашумеў паравоз, абвеяў не цёплаю парай і дымам, схаваўся за будкаю. Выстукалі перад вачыма чырвоныя вагоны. Прагуркацеў астатні вагон, і Ліза перайшла лінію. Абхаціў яе сум. Выразна заўважыла восень, імглу, прыпомніла, што аблічча было, бы зямля, змарнелае, колькі ні памазвала крэмам і памадаю, а яно было адпалькавае. Нават рабілася горшым. І так зажадалася ёй пайсьці ў цэнтр места, спатыкаецца з Пецяй, зьмяпаецца з чалавечым струменем, забыць Міну і Валю, панава выйсьці замуж, каб муж езьдзіў куды-колечы, а яна ў цэнтры гуляла, на вітрыны глядзела; купіла б вось той дарагі крэм—ён напэўна памог бы.

Прышла в аптэкі, села і задумалася. Пастукалі ў дзьверы.

— Тут жыве Лізавета Шарэпа?

— Тут, зайдзеце.

* * *

Ліза была сама не свая. Яна згатовіла сёньня Мішы ўлюблёны суп з курачымі «пупамі», зварила ўлюблёныя яго шофэлі з перцам. Сёньня ў кухні да яе прышла нечаканая радасьць. Захавала яе на грудзёх, спалохалася: а што, як Міша упоперак стане? Вось таму і суп з «пупамі», таму і шофэлі. Гэта ахвяры.

Прышоў Міша, як заўсёды, а палове восьмае. Стол накрыты. Абед на стале.

Першы «пуп» Міша зьеў моўчкі. Ні ў чорных, нібы наваксаваных вачох, ні на шэра-жоўтым абліччы, ні на вузкім спацелым лобу не зьявілася ніякіх зьмен. Але другі «пуп» прабіў лёд. Міша схіліў вуглаватую галаву і, смачна чаўкаючы сківіцамі, зірнуў Лізе ў яе будзённыя шэранькія вочы з бялявымі рэдкімі вейкамі.

Ліза асьмелілася зрабіць першы крок.

— Мішачка,—сказала яна ягодна,—а Валя і сёньня гнуў «мацюкі».

Міша палажыў ложку, суровa выпрастаўся. Валя з жахам глянуў на маці.

— Валя, ты гнуў «мацюкі»?—суха спытаўся Міша.

— Гнуў,—ледзь чутна прамовіў Валя.

— А на што ты гнуў іх?

На гэта запытаньне Валя адказу ня меў.

— Мама гне „мацюкі“?

— Не...

— А нава?

— Не...

— А я табе казаў брацъ прыклад з таты і мамы?!

— Казаў...

— А чаму-ж ты не бярэш?

І на гэта пытаньне Валя адказу ня меў.

— Ліза!.. Дзягу!

— Татачка!.. ня буду! ня буду!..

Міша—суддзя суровы: дзесяць удараў дзягаю адмерыў, і Валя ў кутку на каленках шэптам паўтарае «мацюкі», якія чуў на вуліцы. Нібы моліцца.

Цюфэлі адразу награлі халодную атмасфэру правасудзьдзя, усьмешка асалоды заварушылася млявымі праменьнямі на Мішыным абліччы. У Лізы сьпіўся дух.

— Мішачка, я табе нешта пакажу,—сказала яна як найласкавей. Прытуліла і пагладзіла яму грудзі. Міша здаволена рохкнуў.

— Пакажы...

Трасучыся ад радасьці, задыхаючыся ад сумненьняў, выняла Ліза з-за пазухі маленькую паперку.

— Пусьціш, Мішачка?—быццам прашпатала, узяла яго жаўтаватую руку, прытуліла сабе да шчакі.

Міша моўчкі чытаў, а Ліза запчэбятала:

— Прынёс такі малады чалавек. Я на рынак хацела ісьці, а ён зьмёрз, я яму шклянку чаю з сухарыкам, а ён як пачаў: —вы, грамадзянка, вы жонка службоўца, як пралетарка, выбераце, каго хочаце, вы —раўнапраўная... Мішачка, я шэранькую сукню і зялёны капялюшык надзену?!

Міша дачытаў. Гэта была звычайная позва, якая запрашала Лізу на перавыбары месцавога савету.

Міша абурыўся. Позва парушала гадзіньнік яго жыцьця.

— Пікуды! выпрастаўся ён.— Без ябе абыйдуцца.

— Мішачка!..—гэта з дакорам.

— Муж розумам працуй, сушы свае мазгі, а жонка шляпцца?!

— Мішачка!..—гэта ўжо крыху з болем.

— Значыцца, кармі яе, а яна чай з пянэўным суб'ектам?!.

— Мішачка!..—гэта ўж

Партыйнае жыцьцё.

Прэч фракцыянэраў і раскольнікаў.

Аршанскі агульна-гарадзкі партыйны сход з глыбокім абурэньнем пратэстуе проці фракцыйнага выступленьня прадстаўнікоў збанкрутаванай апазіцыі Троцкага і Вуйовіча на VIII пленуме Камінтэрну.

Адкрыты напад проці партыі і Камінтэрну, кіраваньне неабгрунтаваных абвінавачаньняў УсеКП(б) і Камінтэрну ў здрадзе, разьвіцьцё паклёпу, які перакідае усе граніцы, панікёрскія ліквідатарскія настроі стаўленьня з боку апазіцыі, адкрыты бліж з ультра-левымі і правымі ў Нямеччыне і Францыі, паказваюць як далека адыходзяць і адышлі прадстаўнікі апазіцыі ад ленінізму і ад ленінскае партыі і, яшчэ раз даказвае наколькі права была ацна партыя і пленум Камінтэрну, двойчы рашуча асудзіўшая апазіцыю, якая абараняецца ў ультра-левую сацыял-дэмакратычную плынь і сваімі дэзарганізатарскімі выступленьнямі, на справе дапамагаючая горным ворагам камінтэрнскае дыктатуры і сусьветнай кампартыі.

Агульна-гарадзкі партыйны сход вітае пастановы пленуму Камінтэрну і спадзяецца, што ЦК УсеКП(б) ужыве самыя рашучыя меры, каб раз назаўжды пакласьці канец разлагаючай працы апазіцыі ў шэрагах нашае партыі.

Для прыцягненьня грамадзкае думкі шырокіх мас працоўных гораду ў абмеркаваньні сталчых перад намі задач, якія вынікаюць з пастаноў VIII пленуму Камінтэрну, агульна-гарадзкі сход даручае гаркому распрацаваць практычныя мерапрыемствы адносна вывучэньня пастаноў пленуму партарганізацый і папулярызацыі іх у масах беспартыйных.

(Ухвалена аднагалосна).

Абралі новае бюро.

(Гарадзкая яч., Віцебшчына).

На агульным сходзе нашай гарадзкой партячэйкі была заслухана справаздача бюро за час сваей 6-ці месячнай працы.

Дакладчык спыніўся на тых цяжкіх умовах, пры якіх прыходзілася працаваць і зазначыў, што зьніжэньню недахопаў у рабоце перашкаджала пасылка сяброў ячэйкі на райён для правядзеньня розных кампаній.

За справаздачны час ячэйка павялічылася на 3 таварыны. Партвучобай ахоплена 95 проц. ліку члёнаў, якія адведваюць партшколу гораду, заняткі якой праходзяць па вечарох.

У спрочках па справаздачы зазначана, што адным з буйных дасягненьняў у рабоце гэта—шырокі ўдзел у правядзеньні кампаніі па перавыбарах гарсавету і правядзеньня сходаў беднаты.

Адначасова з гэтым адзначаецца павялічэньне аўтарытэту ячэйкі сярод рабочых гораду.

Як недахоп адзначан—нездавальняючы ўдзел ячэйкі ў правядзеньні кампаніі на перавыбарах мясцкомаў прафесыянальных саюзаў, малы рост і малая работа ў галіне агітацыйна-прапагандысцкай працы.

Склад новага бюро абран больш працаздольным і абноўлен на 75 проц. Новае бюро зьверне належную ўвагу на дадзеныя сходам дырэктывы і будуць ня толькі замацоваць дасягненьні і зьнішчаць недахопы мінулай работы, але будуць і новыя дасягненьні.

Сябра ячэйкі.

Цэлы год ячэйка нічога не рабіла

(Вульскі райён, Полаччына).

27-га мая быў агульны сход Вобельскай партыйнай ячэйкі, на якім абгаварвалася справаздача бюро ячэйкі за 6 м-цаў працы.

Па справаздачы былі разгонуты спрэчкі, у якіх прымалі ўдзел амаль усе прысутныя.

Ячэйка знаходзіцца ў такім сельсавеце, які па сваіх умовах павінен быць прыкладным па ўсяму райёну (бо ён знаходзіцца ля чыгуначнай станцыі), на тэрыторыі яго знаходзіцца лясьніцтва, лесазавод, каапэратыў, школа сялянскай моладзі і іншыя арганізацыі і ўстановы, таксама ячэйка арганізавана ўжо даўно і зараз налічвае 20 сяброў і кандыдатаў.

Здавалася-б, што праца ячэйкі павінна быць добрая, бо і стаж ячэйкі вялікі і колькасьцю не малая, але трэба сказаць, што ўсё-ж праца ячэйкі ня зусім наладжана.

Навакол ячэйкі шмат культурных сіл, якія-б магчыма было скарыстаць пры правядзеньні культасьветнай працы на вёсцы, але ячэйка не скарыстоўвала гэтыя сілы і наогул ня прыбліжае іх да сябе.

Таксама нічога ячэйкай не рабілася на выяўленьні сялянскага актыву і аб'яднаньні яго вакол сябе. Ды яна і не магла вывяць гэты актыў, калі ня мела добрай сувязі з сялянствам; значная частка сялянства нават ня ведае аб тым, што існуе ў Вобальскім сельсавеце партыйная ячэйка. А сялянства цікавіцца працай партыі на вёсцы. Быў такі выпадак, што сяляне аднае вёскі на сваім агульным сходзе пастанавілі прасіць партыйную ячэйку, каб яна паведамляла іх, калі адбываюцца партсходы дзеля таго, каб магчыма было прыходзіць на гэтыя сходы і пагледзець, чым займаецца партыйная ячэйка. Але адказу яны не атрымалі. Вось невялічкі прыклад, які характарызуе сувязь ячэйкі з сялянствам.

Праца сярод беднаты зусім адсутнічала, бо ў бюро быў такі погляд, што ў Вобальскім сельсавеце няма кулакоў, а пагэтаму і не патрэбна праца сярод беднаты, ня гледзячы на тое што было досыць дырэктыў з райкому адносна гэтае працы.

Ня гледзячы на тое, што ўва ўсіх установах працуюць сябры, або кандыдаты партыі, між тым праца пастаўлена ня вельмі добра. Гэта тлумачыцца тым, што ня было кіраўніцтва ячэйкі сельскім саветам, каапэрацыяй, к-там узаемадапамогі і іншымі ўстановамі і арганізацыямі, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсавету.

Пры лесапільным заводзе была партыйная фракцыя, але яна зусім не працавала. Наогул ячэйка не прымала ўдзелу ў гаспадарчай працы. Сельскараўскі рух разьвіт, але праца ня зусім добра пастаўлена і прадстаўнік ячэйкі ніколі не зьяўляўся на сходы і насяджэньні.

Слаба было кіраўніцтва камсамолам і піанэрэтрадамі. Такое-ж самае становішча і з жаночай працай. У галіне беларусізацыі ячэйка нічога не прадпрыняла, тое-ж самае і з палітадукацыяй. Партшколу-перасоўку наведваў адзін толькі сябра ячэйкі.

Усе гэтыя недахопы залежаць ад таго, што было непрацаздольнае бюро, якое не магло кіраваць працай, і нават нерэгулярна рабіла свае насяджэньні. Усе гэтыя недахопы былі падкрэсьлены агульным сходам. Абралі новае бюро з больш працаздольных таварышоў, якому дадзены дырэктывы ўзьняць працу ячэйкі на належны ўзровень.

З. Гіндзін.

Дзейнасьць партшкол-перасовак на Полаччыне

Райпартарганізацыі Полацкай акругі сёлета абслугоўваліся 24 партшколамі-перасоўкамі, з якіх працавалі пабеларуску—17 школ, паўрэйску—3, на расейску—2, на польску—і на лат. мове—1 перасоўка. Ня гледзячы па шэраг перашкод як арганізацыйнага, так і мэтадычнага характару Полацкі акругком КП(б)Б сумеў правесьці 3 выпускі за гэты навучальны год. Усімі 24-мя школамі-перасоўкамі, выпушчана ўсяго—607 асоб, з якіх 176 партыйцаў, 317 камсамольцаў і 114 беспартыйных. Адсюль відаць недастатны лік партыйцаў, выпушчаных перасоўкамі і на самай справе склад школ-перасовак быў партыйным толькі на 29 проц., гэта значыць, што перасоўкі зьяўляліся пераважна—камсамольскімі.

Трэба адзначыць, што ў параўнаньні з мінулым навуч. годам сець партшкол-перасовак на акрузе значна ўзрасла (было 9 школ,—сёлета 24 шк.). Як адмоўныя моманты, трэба падкрэсьліць тое, што ў працягу ўсяго году райкомы партыі не спраўляліся ў большасьці з камплектаваньнем школ-перасовак; партячэйкі не падрыхтоўвалі складу апошніх, ня сурёзна падыходзілі да вылучэньня таварышоў у перасоўкі і г. д., дзякуючы гэтаму працэс камплектаваньня школ праходзіў надта доўга (ад 1 да 2-х тыдняў) і меў у сваім выніку тое, што склад слухачоў перасовак быў неадпаўковым і нават выпадковым.

Бядноцкая частка вучняў атрымоўвала ад школ грашовую дапамогу ад 20 да 50 кап. у дзень. Перасоўкамі і іх загадчыкамі праводзілася значная грамадзкая праца; прымаўся ўдзел у практычнай працы с.-с. і інш. сельскіх установах і арганізацыях. Апраўдалі сабе існаваўшыя пры большасьці школ школьныя саветы, выявіўшыя свой твар, як жыцьцёвыя формы самакіраваньня.

Пасьпяховасьць слухачоў характарызуецца наступнымі лічбамі: усяго скончыла—72,93 проц. усіх слухачоў, з іх добра 33,50 проц., здавальняюча 45,89 проц і слаба 20,61 проц. Ры гэтым лепш за астатніх слухачоў скончылі камуністы.

Перасоўкі бязумоўна далі ў асноўным некаторую тэарэтычную падрыхтоўку выпушчанаму партыйнаму, камсамольскаму і беспартыйнаму актыву, далі ім магчымасьць зразумець лінію і палітыку партыі і асноўныя пытаньні сацбудаўніцтва, а таксама разабрацца ў асноўным сэнсе спрэчак, адбыўшыхся ў нашай партыі ў перыяд як да, так і пасьля 14-га парт. зьезду.

П. Жыгуноў.

Камсамольцы ў гаспадарчай працы.

(Высачанскі р., Віцебшчына).

Калі наглядзець на ўдзел камсамольцаў Кабыльніцкай яч. КСМ у с.-г. працы, дык убачым: у шмат камсамольскіх гаспадарках сеецца канюшына; ёсьць гаспадаркі, у якіх камсамолец увёў тое ці іншае культурнае начынаньне, напр., уцяпленьне хлева, у высеньнюю пасяўную кампанію па ініцыятыве некаторых камсамольцаў атрыманы ў сел.-гасп. складзе розные насеньне ў крэдыт, як-та: віка, авёс, канюшына, лубін і г. д.

Але поруч з камсамольцамі, якія ўводзяць культурны пачын у сваёй гаспадарцы, маюцца і такія, якія зусім ня цікавяцца нават начытаць с.-г. літаратуру.

Вось на гэта бюро яч. павінна зьвярнуць увагу і растлумачыць камсамольцам неабходнасьць чыткі с.-г. літаратуры і прыстасаваньня ведаў у гаспадарцы.

Зуевіч.

Жыльлёвае будаўніцтва ў БССР

На жыльлёвае будаўніцтва па лініі «жылсаюзу» сёлета асигнавана 1 мілён 300 тысяч руб.—Сёлета у БССР будзе пабудавана каля 400 новых кватэр для рабочых і служачых.—Рабочыя пасёлкі і «жакты» зьяўляюцца асяродкамі, дзе вераджаецца быт новай сацыялістычнай грамады.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам старшыня жылсаюзу т. Левін вынёў посьпехі жыльлёвага будаўніцтва за сёлетні год.

На лініі жылсаюзу сёлета на будаўніцтва адпушчана адзін мілён трыста тысяч рублёў. Будаўніцтва асабліва шырока разгарнулася ў Менску, Віцебску, Барысаве, Магілеве і Бабруйску.

На жыльлёвае будаўніцтва ў Менску асигнавана 350 тысяч руб. Зараз заканчваецца будаўніцтва 34-х кватэр, пабудоўка якіх распачалася летась.

Новых кватэр у бягучым годзе будуецца звыш 50. Гэтыя кватэры знаходзяцца ў пасёлках: «Камінтэрн» «1-га мая», Заходняй чыгункі, МБВ, Хлебапрадукту, друкароў, шпалера-друкароў і саюзу працасьветы. У канцы сёлетняга году Менск будзе мець каля 100 новых кватэр з жыльлёвым пляцам да 1000 кв. сажняў.

У Віцебску на кватэрнае будаўніцтва асигнавана 225 тысяч руб. Заканчваецца будаўніцтва 44 кватэр і гэтулькі-ж будуецца новых.

Частка будынкаў—мураваныя, рэшта—драўляныя.

У Барысаве адбываецца выключна пасёлкавае будаўніцтва кватэр, на якое асигнавана 150 тысяч руб. Бягучы будаўнічы сэзон дасьць Барысаву звыш 70 новых кватэр.

На будаўніцтва ў Магілеве і Шклове асигнавана 130 тысяч руб. У Магілеве канчаюць будаваць 49 кватэр, у рабочым пасёлку у Шклове таксама канчаецца пабудоўка 16 кватэр; апроч гэтага, будуецца 20 новых кватэр.

У Бабруйску зараз канчаюць будаваць 45 кватэр; новых кватэр будуецца 15.

Наогул жа, па ўсёй БССР сёлета будзе пабудавана каля 400 новых кватэр. Гэтыя кватэры будуюцца згодна апошніх дасягненьняў тэхнікі і санітарыі.

Кожная кватэра мае 3 ці 2 пакоі і кухню; там, дзе магчыма, праводзіцца электрычнае асьвятленьне і вада. Вакол дамоў закладваюцца сады.

Каб даць дзецям рабочых на месцы нармальнае выхаваньне, узяты курс на арганізацыю дзіцячых пляцовак, ясьляў і інш.

Пры пасёлку «Камінтэрн» у Менску арганізавана зараз дзіцячая пляцоўка, а ў Шклове пры рабочым пасёлку будуюць дзіцячыя яслі.

З крэдытамі на будаўніцтва ня зусім добра. Крэдыты з фонду паляпшэньня быту рабочых нармальна паступаюць толькі на лініі ВСНГ. Цэнтральны Камунальны Банк таксама нармальна выдае крэдыты, а цяляны падатак паступае зусім неакуратна.

Ня ўсё добра і з будаўнічымі матэрыяламі: адчуваецца брак цэглы, з прычыны чаго прыходзіцца і далей будаваць драўляныя дамы, што часам нявыгодна і небясьпечна ў пажарных адносінах.

Тып будаўніцтва рабочых кватэр мае ўжо зараз пэўны стандарт, які нядаўна зацьверджан Дзяржаўнай Плянавай Камісіяй.

Ёсьць намер перайсьці да пэўнага стандарту дзьвярэй і вокан. Ведуцца перагаворы з ВСНГ аб вырабу гэтых рэчаў у значнай колькасьці.

На капітальны рамонт дамоў жыльлёва-каапэрацыйных т-ваў сёлета асигнавана 800 тысяч руб.

Рамонт дамоў у «жактах» вядзецца на гаспадарчым разрахунку. Каб палепшыць якасьць гэтага рамонту, ёсьць намер утварыць рамонтна-будаўнічую кансультацыю.

І.

Там, дзе адпачывае беларускі рабочы.

(ЖДАНОВІЧЫ, ДОМ АДПАЧЫНКУ).

Падарожжа было хоць і невялікае, але цяжкае: вагоны перапоўнены да адказу.

Ажыўляла толькі пагожая раніца, льючы ў вокны віяльготнае чыстае паветра. Міма вокан пралятаці ўзгоркі, пералескі і далінкі, пакрытыя зялёнаю роснаю травою.

Набліжалася 6-я гадзіна раніцы.

— Вось і Ждановічы,—сказаў нехта ў канцы вагону. Рантам вагон заварушыўся. Усе выцягнуліся ў чаргу і чакалі, калі спыніцца цягнік.

Далей, за Ждановічы, паехала ня шмат амаль усе выйшлі на ждановіцкую драўняную пляцформу, і мясцамі падбягаючы, густы тлум накіраваўся цераз горку ў лес.

— Дом адпачынку пачнецца вось зараз у гэтым лесе,—адказаў на маё запытаньне мой сябра па падарожжы.

Ждановіцкі дом адпачынку я ўяўляў сабе больш трохпаверхавым будынкам, але словы «дом пачнецца» разьвеялі гэтае ўяўленьне. Далей, мой сябра растлумачыў, што ждановіцкі дом адпачынку складаецца з асобнага гарадка. Шэраг зусім, адрозьненых адзін ад другога невялічкіх домікаў-дач, сталоўка, амбуляторыя будынкі для жывёлы і інш. Адным словам, дом адпачынку—гарадок, які разлёгся ў маладым сасновым лесе.

Вось ён, прыгожы і зграбны першы домік-дача!

Доўгія цені, якія кінула раніцяе сонца, сустрэўшы густы хвайняк, не як чароўна аханілі яго з усіх бакоў. Адчыненыя вокны прагавіта глынаюць смалісты пах маладых сасонак.

Раскрыжаваўшы рукі, толькі над лёгкімі белымі посьцілкамі яшчэ сьпяць некаторыя рабочыя.

Іншыя ўжо перайшлі ўзгорак і набліжаюцца да рэчкі, а некаторыя купаюцца, напаўняючы ваколіцу рэтам вясёлага гоману.

Яшчэ толькі 7 гадзін раніцы, а рэчка ўжо ажыла. Сям-там палошчуцца ў вадзе асобныя групы. Каля 8-й гадзіны рэчка перапоўнілася. Перад сьнеданьнем кожны сьпяшыў босанаж прайсьціся па роснай траве і папала скацца ў вадзе.

Па глухіх закутках узрэчча пачало пераліваць раха званка.

— Барджэй, хлапцы, апранайцеся. Клічуць на сьнеданьне.

У адзін міг каля сталоўкі сабралася 250 адпачываючых рабочых і служачых. Панаўлову шкляная станоўка—пачала напаўняцца.

Усе з апэтытам упяталі яйкі, сыр, масла і залівалі каваю.

Пасьля сьнеданьня не разыходзіліся. Сабраліся на спэцыяльнай пляцоўцы.

Загадчык дому—доктар—зьлез на табурэтку і пачаў вучыць прагавітых слухачоў, як быць ня толькі доктарам «але самым настаяшчым прафэсарам» у выпадках няшчасных здарэньняў з людзьмі.

Доктар гаварыў добра. Самымі простымі прыкладамі растлумачваў павуковыя пытаньні. Гаварыў весела—усе рагаталі. Гэта і змушала слухаць яго з увагай. Усе выказалі яўнае незадаваленьне калі доктара паклікаў нехта па справе і гэтым прарваў лекцыю.

Пасьля лекцыі разышліся хто куды. Адны—купацца, другія—на фізкультурную пляцоўку, трэція—у гарадок дзе ёсьць розныя віды забаў.

Хутка падышла і 11-я гадзіна. Па сыгналу з розных бакоў зышліся ў сталоўку «абараніць» трохі перад абедам. Пасьлях гэтага—усе ў лес, дзе сёньня надзвычайна цікава. Апроч прыехаўшых раніцою з першым цягнікам, з другім прыбыло шмат экскурсантаў. Ёсьць сваякі, знаёмыя...

Здаралася адна няпрыемнасьць, якая ўзбударажыла ўвесь «гарадок» і прыехаўшых сюды гасьцей. Група экскурсантаў пашла купацца. Паўлазілі ў ваду, напляскаліся з поўгадзіны, вылезьлі.

— Але што гэта значыць, кажа адзін, дзе падзеўся Лейбка Маршак? Адзежа ляжыць на беразе, а яго няма.

— Ты глядзі, мо' ўтапіўся да ліха. Трэба шукаць.

Пабеглі, адзін уверх, другі—ўніз па цячэньні.

— Нідзе няма. Трэба шукаць тут у вадзе.

У момант разьдзеліся два лепшыя плаўцы і праз некалькі хвілін выцягнулі з вады ўжо скарчанелы труп Лейбкі.

Некаторыя з адпачываючых у доме шчыра прыняліся паказваць свае «прафэсарскія» здольнасьці, якімі толькі сёньня абдарыў іх дактар: пачалі аднаўляць утопленіку дыханьне, але нічога з гэтага ня выйшла, бо труп быў халодны.

Усе зьляцеліся сюды. Рэчка апусьцела да вечара. Пры адным толькі ўглядзе на утопленіка прападала ахвота да купаньня.

* * *

Ня дзіва, што ёсьць выпадкі, калі вага рабочага ці служачага, які прабыў 2 тыдні ў доме адпачынку ў Ждановічах, павялічаецца на 7-8 кілёграмаў.

Тут надзвычайна прыгожыя малюнкі прыроды. Тут чыстае паветра, ад якога ў няпрывычнага чалавека круціцца галава. Тут рака і ўсе выды фізкультуры і забаў. Тут сухая, чыстая кватэра з прыадкрытым у маладую сасновую гушчу акном. Урэшце, тут а 7-й гадзіне раніцы фабрычны гудок ня кліча рабочага на працу.

А яда? Ці думаў хто-небудзь з рабочых у 1920 годзе, што на дзесятым годзе Кастрычнікавай рэвалюцыі ён будзе есьці такую яду? А колькі яе? Еш, колькі можаш!

Тут увесь дзень складаецца з таго, што забаўляюцца, ядуць і сьпяць; ядуць, забаўляюцца і зноў сьпяць. Зразумела, адпачываючыя не забываюць і пра асьвету. Запрашаюць розных спэцыялістаў на лекцыі, чытаюць розную літаратуру самі і г. д.

Вось адна бяда: на ўвесь дом адпачынку—адна газэта і тая вывешана на сьценцы «на відным месцы». А газэту хочуць чытаць усе.

* * *

У Ждановічах ужо распачата пабудова 3-хпаверхавай камяніцы. У гэтым доме будзе клюб для адпачываючых, а таксама пакоі для адпачынку ў зімовы час. Пад зімовыя памяшканьні прыстасоўваюцца і некаторыя старыя дачы.

* * *

У 9 гадзін вечара ў розных мясцох лесу заблішчалі электрычныя агні. Тут, у лесе, на правіцы яны выглядаюць неяк нова, зусім ня так, як у горадзе. Гэтыя агні дадаюць тут шмат жывасьці. Домікі-дачы так і вабяць да сябе...

У 11 гадзін вечара празьвінеў званок. Усе зышліся ў сталоўку, выпілі па шклянцы малака і разышліся па дачах.

Сям-там яшчэ было чуваць гоман. Праз некалькі хвілін пачалі тухнуць агні. Сьцілла ўсё. Дзень скончаны...

С. Азерскі.

29-га чэрвеня адбудзецца зацьменьне сонца.

Паводле дукі праф. Міхайлоўскага, зацьменьне сонца 29-га чэрвеня будзе мець наступны выгляд:

Поўнае зацьменьне ахопіць паласу шырынёй у 75 кілёмэтраў. Працяг поўнага зацьменьня—50 сэкунд.

Паласа поўнага зацьменьня сонца пачнецца ў Атлянтычным акіяне, адтуль пройдзе на Англіі, захапляючы Ліверпуль і Дзюртэйм. Накіроўваючыся на паўночны ўсход, зацьменьне перасячэ Паўночнае мора і Скандынавію, дзе пройдзе па паўднёвай і паўночнай частцы Нарвэгіі ад Ставангэра на поўдні да Варангэрфіорду на маўночы, захапляючы Шпэцбэрґэн. Далей, зацьменьне адходзіць у Ледавіты акіян, праходзіць недалёка ад высны Новая Зямля і Таймырскай паўвыспы, у паўночна-ўсходняй Сібіры зноў перасячэ сухазем'е між Чукоцкай паўвыспай і Камчаткай, адкуль пераходзіць у Ціхі акіян, дзе і заканчваецца на ўсход ад Алтэцкіх выспаў.

Працяг часу поўнага зацьменьня ўзрастае ад Англіі (каля 25 сэк.) да Скандынавіі (30—45 сэк.) і далей, дасягаючы максімальнасьці (50 сэк.) у Ледавітым акіяне.

Частка зямной паверхні па абодвых баках паласы поўнага зацьменьня ўключае месцы, дзе гэта зацьменьне назіраецца як часнае, г. зн., што сонца ня ўсё закрываецца месяцам,—частка сонца застаецца незацямнёнай. На паказаным абшары ляжыць уся Эўропа, частка Афрыкі, Паўночная і Цэнтральная Азія, Японія і значная частка Ціхага акіяну. Чым бліжэй да паласы поўнага зацьменьня знаходзіцца месца, тым фаза зацьменьня тут большая.

Найбольшая фаза часнага зацьменьня ў нашым Саюзе (каля 0,97)—на Кольскай паўвыспе, на Мурмане недалёка ад нарвэскай граніцы.

У БССР зацьменьне таксама будзе чаўным. Яно адбудзецца раніцаю 29-га чэрвеня. Пачатак зацьменьня ў розных пунктах БССР між 6 г. 20 хв. і 6 г. 27 хв., канец між 8 г. 24 хв. і 8 г. 34 хв. у залежнасьці ад налажэньня месца, пры гэтым у паўднёвай частцы рэспублікі пачнецца і канчаецца раней, чым у паўночнай. Фаза зацьменьня для БССР у сярэднім 0,75 (для сярэдзіны зацьменьня). Яна больш на поўдні (Полацак 0,80), чым на поўдні (Мазыр, Рэчыца, Гомель—0,73). Такім чынам будзе зацямнёна каля трох чвэрцяў сонеч нага дыску.

Пры наглядзеньні зацьменьня наглядальнікі павінны зьвярнуць увагу на тое, што пры наглядзеньнях зацьменьня, як і наогул, пры ўсялякіх наглядзеньнях над сонцам, неабходна захоўваць вочы ад шкоднага ўплыву сонечных праменьняў: на сонца трэба глядзець праз закуранае шкло дзеля чаго рэкамандуецца пакрыць звычайнае шкло слоем сажы ад сьвечкі і пры наглядзеньні накіроўваць яго закураным бокам да сонца. Добра таксама дзеля гэтага ўжываць самаробныя праўленыя шкіцінны, і іншы раз складаючы іх на некалькі штук для атрыманьня пазадзнай тэмнай слою.

ХРОНІКА.

Прыезд у Менск кіно-экспэдыцыі.

Учора ў Менск з Ленінграду прыехала кіно-экспэдыцыя, якая здымае фільму „Гірш Лекерт". У склад экспэдыцыі ўваходзяць рэжысэр Рашаль, мастак Міхельсь, аператар Казлоўскі і артысты.

Экспэдыцыя будзе здымаць у Менску натуру да фільмы.

Барацьба з эпідэміямі.

У камуне імя Фрунзэ [Сьмілавіцкі р.] нечакана выбухнула эпідэмія сыпнога тыфусу. Менскі акруговы аддзел аховы здароўя асигнаваў 750 руб. на ўзмацненьне барацьбы з тыфусам у гэтым раёне.

Дапамога палітзьняволеным.

У Віцебску і Мазыры ў карысьць Моапру былі праведзены акруговыя лётарэі, якія далі каля 5000 р. чыстага прыбытку. Грошы перасланы на дапамогу палітзьняволеным.

Сродкі на паляпшэньне дзіцячых ясьляў.

ЦК дапамогі дзецям адпусьціў Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя 1500 рублёў на адчыненьне новых дзіцячых ясьляў.

Пераходзім на шматпольле.

Сёлета аграномічныя працаўнікі Менскай акругі прымаюць чынны ўдзел у пераводзе сялянскіх гаспадарак на шматпольле, без папярэдняга пераходу на пасёлкі.

Да гэтага часу пераведзены на шматпольле гаспадаркі в. Варонцкая-Слабада, Шацкага райёну, і цэлы шэраг іншых вёсак.

Эканамічная хроніка.

Суконная тканіна для БССР.

Згодна плану Саюзнага Нар. Кам. Гандлю, для БССР з рэзэрву 3 кварталу г. г. вызначана тонка-суконная тканіны на 60000 р.

Бакалейныя тавары для каапэрацыі.

Маскоўская кантора Белкаапсаюзу купіла ў «Сэвэкольторгу» 60 пуд. сынгапурскага перцу і 120 пуд. цёмн[illegible] прадукты будуць адгружаны ў блізкайшыя дні.

Колькі будзе завезена паперы ў 4-м квартале.

Цэнтрабумтраст у 4-м квартале мае завезьці ў БССР 400 тон паперы. 30 проц гэтай колькасьці паперы—імпортная.

СУД.

Цёплая сямейка.

Уся Аршанчына ведала «сямейку» Жаваранкавых.

Гэта «сямейка» складалася з маткі і сыноў. У вёсцы на Жаваранкавых ніхто не пасьмеў сказаць слова—жыва «заткнуць рот». Усе іх і баяліся. Часам, каб забясьпечыць сябе ад бяспрычынных прычэпак з боку гэтай цёплай сямейкі, некаторыя, нават, хацелі членаў яе.

— Вось добра, што вы паказалі яму, дзе Макар цялят пасе,—казалі ім іншы раз.

Жаваранкавы былі задаволены. У вёсцы яны былі—усё.

Урэшце і прычапіцца ўжо ня было да кого: усе знаходзіліся пад дырыжорскай палачкай, якою кіравала матка Жаваранкавых Макрыда. Дайшло да таго, што палохаць ужо ня было каго, а рабіць нешта хацелася.

У канцы 1923 году Ігнат і Антон Жаваранкавы ўвайшлі ў сяброўства з Кірылам Прыстаўкам і Андрэям Казлоўскім.

Супольнымі сіламі яны адшукалі зброю, умовіліся і 8 лістапада зрабілі разбойны напад на сям'ю гр-на Цалкоўскага ў в. Бароздзіна.

Абарабаваўшы пры вагрэзах зброяй хату на суму да 1.500 руб., яны [разьвялілі між сабою рэчы і разышліся па хатах.

Макрыда, як „добрая" матка, схавала нарабаваныя рэчы, а сыноў пагладзіла на галоўках.

Аршанскі акруговы суд прыгаварыў Ігната Жаваранкава на 4 гады, Кірыла Прыстаўка і Андрэя Казлоўскага на 3 гады зьняволеньня і Макрыду Жаваранкаву—на 3 гады ўмоўна.

С. Азерскі.

Апавяшчэньні.

Дом Асьветы.

У суботу, 25-VI, а 9 гадзіне адбудзецца вечар-канцэрт з танцамі на карысьць Шэфтаварыства Працасьветы.

Білеты зд 30 кап. да 80 кап.—прадаюцца ў Доме Асьветы а 6 гадзіне веч. кожны дзень, а ў суботу—з 12 гадзін дня. 1—2.

— У пятніцу, 24-VI, а 5-ай гадзіне ўвечары ў пам. дому працасьветы адбудзецца культпарада культкамісіяў, групкомаў, мясцкомаў, прафкомаў саюзу працасьветы гораду.

На нараду запрашаюцца таксама камісіі масавай працы і бюро ячэек Авіяхіму.

Парадак дня:
1. Чарговыя задачы масавай працы.
2. Ваенізацыя і задачы ячэек-Авіяхіму.
3. Бягучыя справы.

Просьба не апазьніцца.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ВСЕМ
НЕОБХОДИМО ПРИОБРЕСТИ АВТОМАТИЧЕСКИЙ
СЧЕТЧИК
который без всяких знаний МОМЕНТАЛЬНО дает готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложенным платежом высылается от 3 руб.
Заказы и деньги направлять по адресу: Москва 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, «КНИЖНАЯ ПОЛКА». 2—30.

Вышла в свет и поступила в продажу
КУЛИНАРНАЯ КНИГА
„НАША КУХНЯ"
Составлена применительно к современным условиям по новейшим данным в области питания К. С. МИКОНИ и А. Е. ГРЕЙБ под редакц. Е. М. ШВЕЦОВОЙ.
С приложением таблиц:
1) Состав пищевых продуктов.
2) Важнейшие свойства витаминов.
3) Сортировка мясной туши (с 3-мя схемами)
СВЫШЕ 500 РЕЦЕПТОВ КУШАНИЙ, НАПИТКОВ, ЗАГОТОВОК и пр. Цена 1 р. 50 к.
Высылается также наложенным платежом.
ТРЕБОВАНИЯ АДРЕСОВАТЬ: Москва 9, Тверской бульвар 26, Изд. Изд. О-ву „ОГОНЕК".

К СТРОИТЕЛЬНОМУ СЕЗОНУ
книги по строительной технике.
И. Фадеев.—Строительное искусство. Часть 1. Материалы и работы. С 251 рисунком и 13 табл.—4 р. 50 к. Часть II. Основания и фундаменты. Части зданий 4 р. Проф. В. Д. Мачинский.—Архитектура специальных зданий. Постройки местного, хозяйственного, промыслового и общественного назначения. С 405 рис. в тексте. 414. В перепл.—7 р. Проф. Л. А. Сер.—Архитектура промышленных зданий. (Промышленное зодчество). С 405 чертежами в тексте. В перепл.—7 р. Академик М. Фомин.—Полный справочник по жилищному строительству. 760 стр. больш. формата—7 р. Урочное положение для строительных работ—6 р. Проф. В. Эвальд.—Строительные материалы. С 374 рис.—7 руб. Проф. В. Эвальд, Л. Иогансон, П. Петровский.—Карманный строительный справочник. 448 стр. 355 чертежей—5 р. Песоцкий.—Строительные материалы—90 к. Воробьев.—Кирпичное производство—75 к. Урочные нормы и расценки на электромонтажные работы, т. I—1 р. 10 к., т. II—1 р. 10 к., т. III—40 к., т. IV—75 к., т. V—1 р. Григорьев.—Строительные материалы 4 р. 50 к. Гевирц.—Архитектурные формы и композиция зданий—3 р. Анисимов.—Производство работ по устройству плотин на реках—1 р. 90 к. Бельский.—Сельскохозяйст. гидротехника—3 р. 50 к. Шапов.—Примеры расчетов по гидравлике—1 р. 60 к. Нарнович.—Гидро-техника—3 р. 50 к. Близник.—Производство исследований рек, озер, водораздела как источников гидравлической энергии—3 р. 50 к. Синельников.—Сельское водоснабжение—50 к. Сварро.—Пособие для сельского водоснабжения—3 р. 25 к. Зотов.—Вентиляция на фабр.-заводских предприятиях—1 р. 65 к.
Заказы на все имеющиеся на рынке книги по строительной технике выполняются наложенным платежом немедленно. Составление, пополнение и комплектование библиотек. Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу: Москва, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, «КНИЖНАЯ ПОЛКА». 1—6

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Ці патрэбен гурток раб кораў?

(Завод «Пралетары»).

Спробы склікаць нараду рабкораў рабіліся некалькі разоў, але толькі нядаўна ўдалося яе правесьці.

Ня гледзячы на свячасовае паведамленьне зьявілася ўсяго 18 чал. з 35.

У парадку дня стаяла пытаньне, ці патрэбна арганізоўваць на нашым прадпрыемстве рабкораўскі гурток.

Некаторыя выказваліся, што рабкораўскі гурток у зьвязку з летнім пэрыядам працаваць ня будзе, што, наогул мала знойдзецца ахвотнікаў займацца ў гуртку і што такі гурток патрэбна было арганізаваць пры нашым саюзным клюбе.

З гэтымі думкамі ніхто не згадзіўся. Даказвалі, што на нашым прадпрыемстве рабкораўскі гурток арганізаваць неабходна, бо жыцьцё заводу на старонках газэт высьвятляецца слаба; часамі заметкі аб нашым заводзе пішуць асобы, якія на заводзе не працуюць, што, вядома, нельга лічыць нармальным.

Акрамя таго, у нас маюцца новыя рабкоры, якім патрэбна дапамога і кіраўніцтва. Гэтым рабкорам рабкораўскі гурток зможа даць шмат карысьнага.

Пры рабкораўскім гуртку і насьценная газэта будзе працаваць больш правільна.

Пасьля нарады была праведзена запісь жадаючых займацца ў рабкораўскім гуртку.

Можна спадзявацца, што гурток пры падтрыманьні завкому, партячэйкі і камсамольскай ячэйкі ўпаўне сябе апраўдае.

Рабкор Н.

Шэрагі рабкораў растуць.

(Фабрыка «Просвет»).

Нядаўна на фабрыцы адбыўся сход рабкораў. Быў заслухан справаздачны даклад рэдкалегіі аб праробленай ёй за 6 месяцаў працы. У спрочках адзначаны як дасягненьні, так і недахваты ў працы рэдкалегіі.

Галоўным недахватам зьяўляецца нераўнамернае разьмеркаваньне абавязкаў паміж членамі рэдкалегіі: фактычна працуе адзін член, астатнія мэханічна адбываюць павіннасьць.

Здаралася, што факты, аб якіх гаварылася ў нататках, высьвятляліся няправільна.

Ня было пляннавасьці ў арганізацыйнай працы рэдкалегіі.

Але ёсьць і станоўчыя вынікі працы. Так, паміж членамі рэдкалегіі не заўважваецца больш тых сварак, якія былі раней. Павялічыўся лік пішучых у газэту, павялічыўся вытворчы аддзел у газэце, маецца куток для моладзі.

Увогуле, праца рэдкалегіі прызнана здавальняючай. Новаабрачай рэдкалегіі дадзены дырэктывы зьвяшчыць усе недахваты, меўшыя месца ў працы папярэдняй рэдкалегіі.

К—і.

Насьценгазэта вораг (!?).

(Меншчына).

Як няпрыемна было чуць, але прыйш